Ці выжыве вёска ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Бязмежжа ☞ 12

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 48 (2690) Год LII | Беласток, 2 снежня 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Бенефіс у ружах

Ганна КАНДРАЦЮК

— Бенефіс, — як сказала сама гераіня, — раз у жыцці! І невыпадкова свята арганізавала „Ніва”. У гэтым годзе здзяйсняецца 40 гадоў супрацоўніцтва паэткі з нашым тыднёвікам. За гэты час на нашых старонках выспела сем паэтычных зборнікаў, з якіх тры былі выдадзены Праграмнай радай тыдёвіка „Ніва”. Паэзія Надзеі Артымовіч — прыгожая і праўдзівая з’ява ў беларускім свеце. Невыпадкова літаратурныя крытыкі ставяць яе сярод найвыдатнейшых беларускіх паэтаў XX стагоддзя.

Мерапрыемства пачалося ў чацвер, 22 лістапада 2007 года, роўна ў 19 гадзін у беластоцкай кавярні „Кабарэ”. Першым на сцэну выйшаў Алег Кабзар з музычным падарункам на словы гераіні вечара. Далей імпрэзу павёў Мікола Ваўранюк. Коля здолеў развесяліць гасцей і паэтку ды заставіць яе прачытаць публіцы свае творы. Віншаванні і бярэмя чырвоных руж ад імя „Нівы” перадаў яе галоўны рэдактар Яўген Вапа, які сам асабіста паклапаціўся, каб на свята Надзеі прыехалі госці з Мінска, Брэста і Гродна. Менавіта таму бенефіс быў упісаны ў сёлетні ўжо 11 выпуск літаратурнага семінара „Бязмежжа”. Паэтку павіншавалі юбілейнымі творамі сябры-паэты — Леанід Дранько-Майсюк і Рыгор Сітніца з Мінска і Юры Гумянюк з Гродна. Прыгожы жэст у бок беларускай літаратуры выказала прафесар Тэрэза Занеўская. Хоць сама была непрысутнай на свяце, напісала віншавальны ліст, які зачытала Валянціна Швед. Адметнае месца занялі дэкламацыі на беларускай, польскай ды кітайскай мовах. Творы на мове арыгінала прачыталі Іаанна Стэльмашук і Аліна Ваўранюк, вершы на польскай мове прэзентаваў акцёр Дар’юш Шада-Бажышкоўскі, а па-кітайску — карэспандэнт Польскага радыё ў Кітаі Тамаш Саевіч.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Мікола Ваўранюк як вядучы ўмеў Надзею „прымусіць” выказацца

Тамаш прыляцеў на ўрачыстасць проста з Пекіна і прывёз з сабой верш Надзеі Артымовіч размаляваны кітайскімі іерагліфамі.

Музычны падарунак і пажаданні ад рэдакцыі „Дзеяслова” перадаў паэт і бард Эдуард Акулін з Мінска. Эдуард ахвяраваў паэтцы і свой дыск з песнямі. Радыё „Рацыя” і Польскае радыё Беласток, у сваю чаргу, прынеслі ў падарунак радыёпрыёмнікі. А бенефісцкі настрой *люзіку* наклікаў сваёй „Баладай маршандскага дзеда” паэт і празаік Ян Камінскі. Бенефісцкія балады Янка гэта ўжо свайго роду легенда. З балады, прысвечанай Надзеі, сабраныя даведаліся пра кулінарныя здольнасці гаспадыні вечара.

Цяжка пералічыць усіх выступоўцаў. Здавалася, віншаванням і словам захаплення не было канца. Апрача сяброў-літаратараў прысутнічаў і афіцыёз. З найлепшымі пажаданнямі ад імя Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына” выступіла Ніна Шыдлоўская з Мінска. Былі таксама прадстаўнікі беларускага консульства ў Беластоку і беластоцкага епіскапа Іакава. На свята ў прыстойнай кампаніі завіталі працаўнікі Дэпартамента культуры Маршалкоўскай управы з нашым членам гэтай управы Міколам Яноўскім. Пры нагодзе віншаванняў расказаў ён пра гістарычнае здарэнне ў сваёй установе. Два дні да бенефісу ў ягоным кабінеце сустрэліся чатырох беларусаў і спантанна сталі размаўляць на сваёй мове.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Вершы паэтэсы трапілі ў Кітай

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Мікола Яноўскі віншуе ад імя свецкай улады...

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Да віншаванняў далучыўся і свет духа: а. Уладзімір Місяюк, паэт Юры Плютовіч з жонкай, фатограф Віктар Волкаў

Бенефіс завяршыўся выступленнем гурту „Ілo з сябрамі” з салісткай у асобе нашай рэдакцыйнай сяброўкі Ілоны Карпюк. Як адзначылі госці з Мінска, усё мерапрыемства трымалася на высокім энергетычным уздыме і глыбокай уражлівасці. Мяне асабіста ўразіла вялікая колькасць руж — кветак, якія так любіць паэтка.

Слухай сваё

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

на новай частаце 98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

98,1 FM

новая частата !!!

Мы даступныя кругласутачна ў Інтэрнэце!

www.racyja.com

Адрас:
Białoruskie Radio Racja
ul. Ciepła 1/7
15-472 Białystok
e-mail: radioracja@wp.pl
tel. 085 654 51 93

Рэклама

Замкнутае кола

Хто прыдумаў кола — ніхто не ведае. І ніхто аж каб занадта гэтым не цікавіцца, бо ў тым няма асаблівага сэнсу. Чалавецтва, папросту, убачыўшы ўсе мажлівасці гэтай прыдумкі, стараецца максімальна выкарыстоўваць яе. Вынаходніцтва тое простае, як і ўсё геніяльнае, і моцнага тэхнічнага ўдасканалення не патрабуе. Можна яго зрабіць жалезным, гумовым, большым, меншым, але прынцып працы застаецца той жа. І мяняць гэты прынцып нікому ў галаву не прыходзіць.

У эканоміцы, як і ў тым коле, таксама ёсць свае непарушныя законы, якія, зноў жа, даўно вядомыя. Кожная гаспадыня ведае, што калі заробак меншы чым расходы, то трэба недзе браць дадатковыя грошы. Можна іх пазычаць, але ж трэба тады нечым аддаваць. Не зможаш вярнуць сам, прыйдзецца над тым працаваць дзецям. Выйсце адно: працаваць трэба больш эфектыўна, выкарыстоўваючы тыя здольнасці і мажлівасці, якія, як кажуць, Божанька даў.

Вось і дзяржава, ці дакладней яе ўрад і тыя дзяржаўныя структуры, якія мусяць дбаць пра эканоміку, павінны мець прыкладна такія падыходы. Большасць так і робіць. І жывуць някепска. Адны выкарыстоўваюць свае рэсурсныя багацці, тыя, хто іх не мае, зарабляюць на тэхналогіях або паслугах. Адным словам на тым, што ёсць. А ў кожнага нешта знойдзецца. Швейцарыя панаставіла банкаў ды гарантуе патаемнасць укладаў, Грэцыя набудавала ля мора гатэляў ды запрашае турыстаў, Нямеччына, грунтуючыся на педантычнасці характару свайго працоўнага класа, засыпала ўвесь свет „Фальксвагенамі", а Аўстрыя, нават падчас глабальнага пацяплення, умудраецца пасыпаць схілы сваіх маляўнічых гор штучным снегам, каб нехта прыехаў на іх паглядзець і пакінуць там свае грошы. І ўсе неяк на хлеб зарабляюць ды і на масла ім застаецца. Кожны ведае свае мажлівасці, ахоўвае іх і працуе над іх максімальным выкарыстаннем з карысцю для сябе.

Беларусь таксама не абдзеленая ласкай Творцы. І найвялікшы яе здабытак — геаграфічнае становішча. Мець краіну, якая раскінулася паміж Усходам і Захадам, ды яшчэ з даўніх часоў звязвае Поўнач ды Поўдзень гэта такі падарунак лёсу, які ні немцам, ні рускім і не сніўся. Тут і галаву ламаць ні над чым не трэба. Сядзі ды падпісвай кантракты. Дай сваім грамадзянам эканамічную волю, а тыя самі даробяць тое, чаго не ў змозе адужаць дзядзькі ў міністэрскіх кабінетах.

Але ж не. Такой волі даваць ніхто не збіраецца. Беларускія міністры глядзяць на ўсё па-свойму. На месцы суседніх краін, я б плаціў ім добрыя заробкі, бо калі прааналізаваць сітуацыю, то яны больш дбаюць пра эканамічную бяспеку іншых, чым сваю.

Вось, напрыклад, палякі абмежавалі ўвоз на сваю тэрыторыю цыгарэт, алкаголю ды паліва. Тут усё зразумела. Гэта тыя тавары, на якія дзяржава наклала акцыз і бярэ з таго вялікія грошы. А калі нехта з іх грамадзян зможа вывезці з Польшчы тыя рэчы, то з яго і акцызы паздымаюць, і льготныя ўмовы падаткаабкладання дадуць. Вывозь колькі хочаш, а ўвозіць нельга.

Беларускія ж чыноўнікі таксама чамусьці дбаюць пра інтарэсы Польшчы. І яны вырашылі забараніць сваім грамадзянам вывозіць з Беларусі ў Польшчу цыгарэты, алкаголь ды паліва. Памежнікі на беларускай мяжы нават перапісваюць тых небаракаў, якія з поўнымі бакамі саляркі часта выязджаюць да суседзяў, і шукаюць у іх „забароненыя" тавары.

Ды і Расія павінна шанаваць нашых чыноўнікаў. Яна вельмі баялася, што пры наяўнасці сваіх заводаў па выпуску легкавікоў, актыўныя людзі засыплюць усю Расію іншамаркамі праз тэрыторыю Беларусі, з якой у Расіі няма нармальнай мяжы. І тут нашы дапамаглі. Не маючы сваіх легкавых машын, яны на іншамаркі ўвялі такія „растарможкі", што расійскія вытворцы ні пра што не мусяць клапаціцца.

Вось і атрымліваецца ўсё па словах беларускага класіка, які сцвярджаў, што беларусам Бог даў усё што толькі можна, але, каб іх краіна не здалася раем на зямлі, ураўнаважыў тыя падарункі, наслаўшы кепскае кіраўніцтва.

А тое кіраўніцтва добра ведае, што іншага кола не зробіш. Проста, каб яно запрацавала, трэба даць людзям эканамічныя свабоды. Але вось эканамічнай свабоды без палітычнай не бывае. Ды толькі наконт палітыкі ёсць іншыя меркаванні. Вось тут кола і замкнулася.

Віктар САЗОНАЎ

Рэтра-транспарт (2)

З чатырох чыгуначных пуцей, што выходзілі з Гайнаўкі, стогнучы пад цяжарамі ўсялякіх грузаў, зараз астаўся толькі адзін, у Чаромху. Яшчэ хаўкае ён толькі дзякуючы ін'екцыям з падляшскай Маршалкоўскай управы ў транспарт, які штораз больш разыходзіцца са здаровым сэнсам. Але пакуль ёсць у нас галасістыя людзі, якіх менталітэт астаўся ў XIX стагоддзі, гэты спектакль можа яшчэ прадаўжацца.

У напрамку Орлі думаў я паехаць на курсавым аўтобусе. На той аўтобус на адпраўной платформе чакала яшчэ пятнаццаць асоб — амаль усё вакзальнае пасажырства, пераважна пажылыя жанчыны, якія ў Гайнаўку прыехалі за пакупкамі — быў жа гайнаўскі тарговы дзень — серада, — а цяпер накіраваліся вяртацца дадому, з поўнымі сумкамі. Мо былі яны з Махнатага, мо са Старога Корніна, а мо нават з Мора ці Крывятыч. Людзі згаварыліся пра хлеб, што калісь выпякалі самі ў печах, а цяпер памянялі свойскі хлеб на куплёны. Адзін мужчына заўважыў, што гэта Герэк даў калісь сялянам грошы, каб цяпер маглі яны хлеб купляць.

— Ах, дай Божа яму здароўе і няхай ён жыве нават сто пяцьдзесят гадоў! — заявіла адна з жанчын.

А калі ёй сказалі, што Герэк даўно ўжо памёр, яна прызналася, што не ведала гэтага пра свайго куміра і пажадала цяпер яму царства нябеснага і лёгкай зямелькі.

Чаканы аўтобус не прыязджаў. І не было як даведацца, што з ім здарылася. На стаянцы стаялі два бельскія аўтобусы, але шафёраў у іх не было; на вакзале павятовага горада царыла поўная адсутнасць інфармацыі. Жанчыны загаварылі пра таксі, але ж і таго няма зараз пад гайнаўскім вакзалам. Згадвалі яны таксама пра пешую вандроўку, але гэта было фантазіраванне, бо для большасці з іх уласныя ногі былі ўжо дакучлівым грузам. І сталі яны таксама нервавацца, і разгубляцца... Прыехаў яшчэ адзін бельскі аўтобус і адна з гэтых жанчын даведалася ў шафёра, што чаканага аўтобуса не будзе...

Пад'ехаў аўтобус у Беласток. Некаторыя з гэтых старавінак падняліся па ступеньках у салон. Адной з іх сказаў я, што аўтобус едзе ў Беласток праз Навасады.

— А няхай і праз Навасады, абы бліжэй Беразова, — заявіла яна мне...

Такі адчай — абы з Гайнаўкі, абы-куды. Можа ўдасца, можа здарыцца цуд. Нават малодшая панюська, недзе так пад тры з паловай дзесяткаў гадоў, якая да гэтага прачытала бадай усе расклады аўтобусаў, яшчэ запытала шафёра, ці не паедзе ён праз Бельск...

Гайнаўскі вакзал сёння антыгуманны. Ён быццам і ў сярэдзіне горада, а быццам і ў чыстым полі, бо ў горад ад яго далёка і нічога там гарадскога няма. Пажылыя людзі карыстаюцца ім хіба толькі па інерцыі, па прывычцы. Ён становіцца міражом, што прыманьвае людзей на пакуты — насмешлівым ашуканцам...

Я ўжо быў калісь тут згадваў пра роўненькую гайнаўскую плошчу, якую яшчэ займаюць чыгуначныя рэйкі, а якая магла б быць узлётна-пасадачнай дарожкай аэрадрома. Магчыма, што калі мова пра гэтакую пляцоўку, дык людзі адразу думаюць пра далёкарадыусныя авіялайнеры. Але калі ўзяць на думку лятучыя аўтобусы для трыццаці-сарака пасажыраў, якія б тут пераселі на сухапутны транспарт... На якіх у прыпушчанскую Гайнаўку маглі б прылятаць такія групы амерыканцаў або японцаў. Час ад часу і нейкі грашавіты арабскі або маскоўскі эмір са сваім гарэмам мог бы такім шляхам пабачыць пушчу. Або царкоўныя хоры заміж таўчыся па паяздах або аўтобусах на Дні царкоўнай музыкі. А машыны з мясцовымі купчыхамі маглі б жа спыняцца перад магазінамі. І грунт у чыгункі можна было б забраць так, як у сялян пад аўтастрады. І думаю, што для такога праекта знайшлася б падтрымка не толькі ў самой „варшаўцы".

Але гэта толькі мой міраж. Бо пра будучыню горада вырашае чынавенства. А яно ў нас такавусенькае, як у творах Чэхава, візантыйскае, з пільнай аглядкай на вышэйшыя чыны. Бо ж ці можна нават падумаць пра штось такое ў Гайнаўцы, чаго нават у Беластоку няма? І ці ў прынцыпе пра што-небудзь любое можна падумаць, калі такое думанне можа не спадабацца важнейшым чынам? Калі „свайму" мітрапаліту не спадабаўся „неканонічны" гайнаўскі Фестываль царкоўнай музыкі, гайнаўскае чынавенства тут жа той фестываль выдварыла з Гайнаўкі. Бо тут жа „свой" электарат, які падтрымае такога чыноўніка, пра якога скажуць, што і ён „свой".

У ваяводскім Беластоку нядаўна было таксама, але, здаецца, крыху цяпер змянілася; здаецца, што беластоцкі электарат *zabrał babci dowód*. У Гайнаўцы, відаць, яшчэ стаўка на традыцыю — каб іерарх мог там катацца на такім кананічным транспарце, на якім па Іерусаліме ездзіў калісь Ісус.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Ліст прэзідэнту Т.Т.

Мінула нядаўна больш за год часу з таго моманту, калі Вы нам у Беластоку сталі на пасаду, з нашага — большасці жыхароў — выбару. З выбару — як за гэты час аказалася і па ўсім відаць — трапнага, глядзеўшы на тое, як усё вакол змяняецца. Тым не менш тое, што пішу Вам, гэта толькі мае прыватныя меркаванні: мужыка, які нарадзіўся ў гэтым горадзе больш за сорак гадоў таму, у той яго частцы, дзе ўжо няма, дзякуючы Вашай здзяйсняльнай моцы, майго драўлянага дома, а дзе „даспявае" чарговы шматпавярховы маркет. Маркет, ці як хто хоча — галерэя, на славу рынку працы, але і нядзельных пусцячын, якія для беластачан становяцца адной з найбольш прыцягальных у горадзе атракцыёнаў. Бо Беласток усё ж з'яўляецца засценкам. Што гэта значыць? Спасылаюся на Вашы словы: „Засценкавасць — гэта асабліва аб'ёмістая з'ява: слова-адмычка. Вядома, гэтая ацэнка адмоўная, ды не да канца вядома, што з яе вынікае". Можа і не да канца, аднак штосьці ж вынікае. Вось хоць бы тое, што студэнты беластоцкіх вучэльняў, аб якіх Вы, як выкладчык з сантыментам не раз успамінаеце, увесь час застаюцца „выкшталцюхамі" РП (без нумарацыі) ніжэйшай катэгорыі. Я прашу не хваляваца, але дыплом Ягелонскага універсітэта, Каталіцкага люблінскага універсітэта ці былога айчыма беластоцкай альма-матэр — Варшаўскага універсітэта ўсё ў большай цане пры прапанаванні свайго CV на гэтым рынку працы. Больш таго, маладыя людзі, якія ў гэты спосаб, значыць, выбіраючы пазабеластоцкія вучэльні, уцякаюць са сталіцы Падляшскага ваяводства ўжо ў прынцыпе (у час выбару іншых вышэйшых устаноў) не намерваюцца сюды вяртацца. Думаю, што ў Беластока праблема, якая ў час апошніх парламенцкіх выбараў і ў экспазе Вашага шэфа (ведаю, ведаю, афіцыйна Вы сталі прэзідэнтам толькі па рэкамендацыі ГП) датычыць усяе краіны, асабліва ў кантэксце выездаў у Брытанскае Каралеўства. Што Вы прапануеце, каб тыя Яны, пазабеластоцкія студэнты, аднак беластачане, сюды хацелі вярнуцца. Колькасць маркетаў гэта не заахвочванне, нават калі б перавысілі тыя варшаўскія Залатыя Тэрасы. Кажаце: Падляшская опера, універсітэцкі кампус ці пляц перад Ратушай з маючым адкрыцца лядовым катком. Капелюшы зняць! Ды гэтага недастаткова. Гаворка аб засцянковасці. Тлумачу. Справа ў клімаце, магіі Беластока, у тым, што ў далейшым з'яўляецца ён такой своеасаблівай пачакальняй паміж вёскай і метраполіяй (не толькі з назвы).

Хваліцеся пабудовай залатых тэрасаў, кампусам, катком, ліквідацыяй агіднага базара ля Юравецкай і сваёй рашучай пазіцыяй. І зноў прывяду Вашы словы: „Я хацеў бы паказаць, што сучаснае кіраванне, хуткае вырашанне нават найбольш супярэчлівых пытанняў, дынамічнае развіццё Беластока магчымыя. Я веру, што ўдасца нам змяніць перакананне шматлікіх асоб, паводле якіх дзе як дзе, але ў Беластоку „гэта не можа ўдацца". Таму, вось, пытаюся, што з гэтым кліматам, магіяй Беластока? Як выкрасаць дух у гэтай чакальні? Пытаюся пра гэта па-беларуску. Можа, вось, тудою дарога, тудою, значыць, шляхам тае слоганнай яшчэ шматкультурнасці. І не хопіць тут адно падарожжаў у Ізраіль. Ёсць тут, у гэтым горадзе, не толькі месцы памяці, але і жывая гісторыя, якая дыхае кожным беластоцкім днём, якая прагне сабою дзяліцца. Як звычайна кажуць у касцёлах: „абагачацца". Прымяняючы слова, якім ахвотна карыстаецца Ваш калега з палітычнага заплечча, пакуль адсунуты ў кракаўскі цень, можа якраз „вартала б" ісці таксама гэтай дарогай. Тым больш, што апошнія тыдні стварылі Вам амаль графскую сітуацыю, у кантэксце палітычных змен на парламенцка-ўрадавай сцэне (катку?).

Застаюся з павагай —

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Расследаванне „Нівы"

Хто выжыве на вёсцы?

Аляксей МАРОЗ

З-за вялікіх чэргаў, у якіх па некалькі дзён тысячы сялян стаялі перад ваяводскімі аддзяленнямі Агенцтва развіцця і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі, каб атрымаць вялікую грашовую ўспамогу на мадэрнізацыю сваіх гаспадарак, наша грамадства ўспомніла пра земляробаў і стала гаварыць пра іх праблемы і поспехі. У некаторых гараджан паявілася нават зайздрасць, калі пачулі, што „большыя" гаспадары атрымаюць па сто, дзвесце ці нават трыста тысяч злотых грашовай дапамогі з еўрасаюзнага і дзяржаўнага бюджэтаў, а раней чулі пра пастаянныя даплаты да сельскагаспадарчай прадукцыі. Аднак звычайныя гаспадары надалей гавораць пра нізкі даход з сельскагаспадарчай вытворчасці, які ў малой ступені павышаюць нават пастаянныя еўрасаюзныя даплаты. Сяляне бачаць, што дапамогу размерам у сотнях тысяч злотых атрымліваюць толькі адзінкі з іх вёсак, якія яшчэ раней узбуйнілі свае гаспадаркі і пачалі вялікія інвестыцыі, калі зямля і сельскагаспадарчыя машыны былі намнога таннейшымі. Большасць гаспадароў мусіць задаволіцца толькі даплатай памерам у некалькі тысяч злотых у год, якой недастаткова, каб дакупіць зямлю, машыны або перабудаваць хлеў, не гаворачы ўжо аб грунтоўнай мадэрнізацыі гаспадаркі. Каб дакладней высветліць як да новай рэчаіснасці прыстасоўваюцца земляробы-беларусы, якія пражываюць у сёлах ці часова ў гарадах, рашыўся я прыглянуцца гаспадаранню і сельскагаспадарчым даплатам на Гайнаўшчыне і Бельшчыне, дзе зямля рознай якасці, а людзі галоўным чынам займаюцца раслінаводствам і жывёлагадоўляй.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Аборы колішніх кааператываў і пэгеэраў найчасцей купляюць прыватныя гаспадары і прыстасоўваюць да сельскагаспадарчай прадукцыі

Ці варта жыць у вёсцы?

Маладыя хлопцы, якія рашыліся на пастаяннае жыхарства ў вёсках і гаспадаранне, ужо з васьмідзесятых гадоў мелі вялікія цяжкасці знайсці дзяўчат згодных на супольнае жыццё і ўтрыманне з бацькаўскіх гаспадарак. Хіба ў кожным сяле маюцца мужчыны сталага ўзросту, якія не змаглі знайсці сабе жонак, і вымушаны гаспадарыць з дапамогай бацькоў. Жыццё паказала, што ў мінулым сярод наракаючых на сваю прафесійную работу найбольш пакрыўджанымі сталі не рабочыя, лекары ці настаўнікі, але земляробы. Добра, што апошнім часам крыху адмяніўся падыход грамадства і вясковых дзяўчат да жыцця ў вёсцы і працы на гаспадарцы. Пажаніўшыся, маладыя людзі пачынаюць жыць у сёлах хаця б з-за жыллёвых складанасцей у гарадах, а хутчэй за ўсё з-за высокіх цэн дамоў і кватэр у гарадскіх блоках. У многіх выпадках гаспадаранне на бацькаўскіх палях становіцца зараз толькі дадатковым заработкам, які папаўняе сямейныя бюджэты людзей, якія на сваіх машынах (часта танна купленых за мяжой) пастаянна даязджаюць на працу ў гарадскія прадпрыемствы і ўстановы. Аднак штораз часцей можна спаткаць маладыя сем'і, якія ўтрымліваюцца толькі з сельскай гаспадаркі. Найчасцей ёсць у іх ужо нейкія сельскагаспадарчыя машыны, крыху раней дакупілі яны поле ці пабольшылі статак кароў, бо бацькаўскія гаспадаркі велічынёй у 10-15 гектараў з 4-5 каровамі не дадуць ужо дастатковага прыбытку для ўтрымання сям'і.

На што выдаткоўваецца дафінансаванне?

Ад часу далучэння Польшчы да Еўрасаюза кожны год нашы гаспадары атрымліваюць даплаты да сельскагаспадарчай прадукцыі, якія прызначаюцца залежна ад велічыні палёў і характару расліннай вытворчасці. Пакрыўджанымі астаюцца ў гэтым выпадку гаспадары, якія разгарнулі гадоўлю кароў ці свіней і ў выпадку абмежаванай расліннай вытворчасці купляюць корм для жывёлы. Хаця прадукцыя ў іх павялічваецца, аднак дафінансаванне астаецца на нязмененым узроўні. Карыстаюць затое жыхары гарадоў, якія — як уласнікі зямлі — дапамагаюць бацькам абрабляць поле і атрымліваюць на яго дафінансаванне. Раней і на нашых землях здараліся выпадкі, што некаторыя гаспадары атрымлівалі даплаты нават за аблагі, але частыя кантролі выдатна абмежавалі паталагічныя з'явы. У асноўным гаспадары атрымліваюць дафінансаванне да прадукцыі збожжавых, ці карыстаюцца даплатамі да лугоў, калі гадуюць кароў або цялят. На Гайнаўшчыне і Бельшчыне ёсць адзінкі, якія гаспадараць на сотнях гектараў палёў і атрымліваюць пастаянныя даплаты размерам у сотні тысяч злотых штогод. Намнога больш ёсць гаспадароў, якія атрымліваюць дафінансаванне велічынёй у некалькі дзесяткаў тысяч злотых. Аднак асноўная колькасць сем'яў у Гайнаўскім і Бельскім паветах вымушана задаволіцца штогадовай успамогай еўрасаюзнага і польскага дзяржаўнага бюджэтаў размерам у некалькі тысяч злотых, бо найчасцей іх гаспадаркі налічваюць да дзесяці гектараў зямлі. Калі разглядаць гэтае дафінансаванне ў катэгорыі мадэрнізацыі гаспадарак, самым важным становіцца спосаб выдаткавання атрыманых грошай. Калі адзін з працаўнікоў прадпрыемства па абсталяванні кватэр пластмасавымі вокнамі тлумачыў, што працавалі яны ў асноўным па вёсках, бо сяляне маглі выдаткоўваць на змену аконнай сталяркі еўрасаюзныя даплаты, стварылася ўражанне, што даплаты да сельскагаспадарчай прадукцыі гаспадары могуць масава „праядаць". Калі яшчэ за еўрасаюзныя сродкі свае хаты перабудоўваюць выхадцы з вёсак, якія ўжо не маюць намеру вяртацца на бацькаўскія гаспадаркі або пенсіянеры, што абрабляюць зямлю перапісаную на дзяцей, гэта яшчэ можна зразумець. Аднак калі за атрыманыя грошы не мадэрнізуюць сваіх гаспадарак людзі, у якіх няма крыніц утрымання па-за вёскай (а выдаткоўваюць іх на дамы ці машыны), перакрываюць яны для сябе дарогу ў сельскую гаспадарку ў будучыні. Многа гаспадароў разумее аднак што цяпер ім трэба зрабіць у сельскай гаспадарцы, каб прадукцыя была рэнтабельнай. Карыстаючыся таксама іншымі крыніцамі фінансавання, перарабляюць яны хлявы і аборы, купляюць новыя сельскагаспадарчыя машыны. Мадэрнізуючы свае гаспадаркі, сяляне ведаюць, што добры новы трактар каштуе прынамсі больш за сто тысяч злотых, а перабудова вялікай аборы або будова новай на сучасны лад будзе каштаваць ужо мільёны злотых.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Многія гаспадары незадаволеныя, што сёлета вельмі абмежаванай будзе даплата да гаспадарання на лугах для тых, хто ў мінулым не гадаваў траваеднай жывёлы (на ягадніцкіх лугах пасвяцца яшчэ статкі авечак) або не зарэгістравалі сваіх лугоў трывала прыстасаваных да прадукцыі кармоў

Ці варта купляць дарагую зямлю?

Каб можна было разгарнуць прадукцыю збожжа або іншую расліннную вытворчасць, гаспадарам неабходна дакупіць ворнае поле. Апошнім часам, калі сталі выплачваць даплаты да сельскагаспадарчай прадукцыі залежна ад плошчы апрацоўваных палёў, продаж і купля зямлі на Гайнаўшчыне і Бельшчыне ў параўнанні з папярэднім перыядам амаль спынілася. Перад тым, як стала паступаць еўрасаюзнае дафінансаванне, можна было купіць гектар адносна якаснай зямлі яшчэ за шэсць тысяч злотых. Цана на поле павышаецца апошнім часам нават па 20-30% у год і зараз на аўкцыёнах Агенцтва сельскагаспадарчай нерухомасці ворная зямля і лугі найчасцей прапануюцца ў цане 8-10 тысяч злотых за гектар. Вядома, найчасцей прадаюцца горшыя ўчасткі, арандаваць якіх адракліся нашы гаспадары і якія часта ляжалі аблагом. Калі зямлю рашаюцца прадаваць сяляне і прапануюць поле, на якім можна вырошчваць пшаніцу, цана можа павысіцца нават да 12-13 тысяч злотых за гектар. Аднасяльчане прадаўца часта перабіваюць адзін другога цаной і прапануюць куплю за штораз большыя грошы. Добра хаця, што ў такім выпадку зямля астаецца ў руках аднавяскоўцаў або гаспадара з суседняга сяла. Калі на аўкцыёнах Агенцтва сельскагаспадарчай нерухомасці прадаецца поле, якое за пенсію перайшло ў распараджэнне дзяржавы, пакупнікі таксама часта прапануюць вышэйшую цану. Нашы гаспадары наракаюць, што яны часта не ў змозе перабіць цаной вонкавых купцоў, якія прыязджаюць з аддаленых мясцовасцей і стараюцца купіць зямлю лепшай якасці для гаспадарання (вядомыя такія выпадкі хаця б у Чыжоўскай гміне), а горшае поле прызначыць пад аблясенне (хаця б у Дубіцкай гміне). Жыхары Збуча прывялі прыклад гаспадара, які побач іх вёскі купіў вялікі кавалак зямлі і прыязджае сюды здалёк абрабляць якаснае поле. Калі ў нас плаціцца ўжо за гектар поля нават раўнацэннасць 4 тысяч еўра, а ў некаторых рэгіёнах Падляшскага ваяводства нават удвая больш, гаспадары ставяць сабе пытанне ці зямля надалей будзе даражэць.

Нашы людзі апасаюцца таксама, што з часам зямлю стануць купляць у нас немцы і грамадзяне іншых еўрапейскіх краін, што яшчэ больш павысіць яе цану. Каб адказаць на гэтыя пытанні, трэба было б прыглянуцца цане зямлі ў еўрапейскіх краінах. Аказваецца, што плата за поле ў нас амаль зраўнялася з цаной зямлі ў Францыі, дзе ў сярэднім гектар поля каштуе 4,5 тысячы еўра. Хаця ў Германіі трэба плаціць у сярэднім па 9 тысяч еўра за гектар зямлі, у Англіі — па 11 тысяч еўра, а ў невялікай Галандыі нават па 30 тысяч, то пакупнікі з суседніх краін масава не хлынулі ў Францыю за адносна таннейшай зямлёй.

(працяг будзе)

Новае Ляўкова

Могільнікавыя гіены

12 лістапада г.г. зайшоў я на парафіяльныя могілкі ў Новым Ляўкове (Нараўчанская гміна). Тут пахаваныя мае бацькі. Пад канец кастрычніка выпала першая гадавіна смерці маёй маці і дзесятая па бацьку. Пацікавіўся я, ці зноў нападала лісце на помнік і як там кветкі на магіле, асабліва вельмі прыгожыя хрызантэмы, якія прывезлі з Беластока мая дачка Ася з мужам і дзяцьмі.

Затрымаўся я ля магілы бацькоў і ўбачыў... хрызантэмаў на ёй ужо не было. І мне стала яшчэ больш сумна. Як жа так?..

Расказвалі мне людзі, што кветкі крадуць на гарадскіх могілках у Беластоку і ў Гайнаўцы ды ўжо апошнім часам і на вясковых могілках, напрыклад, у Новай Волі што пад Міхаловам. А тут, бач, ужо і ў нас тое ж. Дагэтуль чагосьці такога на ляўкоўскіх могілках яшчэ не было. Вось дык нават памерлым крадуць кветкі. Без усялякага сораму. Не ўшануюць месца пахавання нашых продкаў.

На нашых дарогах

У кастрычніку г.г. Праўленне павятовых дарог у Гайнаўцы паспяхова закончыла рамонт пабочын адрэзка дарогі ад скрыжавання ваяводскай дарогі Навасады — Нараўка — Новае Ляўкова — Бандары з павятовай Тарнопаль — Семяноўка. І зрабіла гэта салідна і старанна.

Ехаў я гэтай дарогай 7 лістапада і дакладна прыгледзеўся. Усе з'езды з дарогі і пад'езды, усе разбітыя-раз'езджаныя пабочыны навезлі пяском і гравіем ды расплянтавалі. Не частая гэта з'ява на нашых трактах. Цяпер гэтая павятовая асфальтавая дарога стала яшчэ больш бяспечнай.

(ян)

Адкінулі адзінага

Міхал МІНЦЭВІЧ

У судовай практыцы ў вынясенні прыгавораў удзельнічаюць не толькі суддзі, але і народныя засядацелі. Кандыдата ў засядацелі вылучаюць выбаршчыкі, а назначае яго выключна Гмінная рада. З новым годам у судах з'явяцца новыя засядацелі.

На мінулы тэрмін з Арлянскай гміны кандыдатуру ў засядацелі падало некалькіх кандыдатаў. Тадышняя Гмінная рада мела з каго выбіраць-перабіраць і выбрала максімальную іх колькасць, значыць двух ад гміны — з Орлі і Градалёў. Сёлета заяўку падаў толькі адзін ахвотны — і хаця задавальняў усе патрабаванні, але — як ні дзіўна і незразумела — ягоную кандыдатуру радныя на сесіі 28 верасня г.г. адкінулі ў тайным галасаванні (6 было „за", а 9 — „супраць"). А тым кандыдатам быў Уладзіслаў Камарчук, заслужаны саліст „Арлян", які безаварыйна на працягу трыццаці гадоў працаваў шафёрам пэкаэсу.

Кандыдатуру Уладзіслава Камарчука падало дваццаць семярых жыхароў Орлі. Яшчэ да галасавання адмысловая камісія з ліку гмінных радных дала станоўчую ацэнку кандыдату ў засядацелі Раённага суда для разгляду сямейных спраў. У дзяржаўным рэгістры пакаранняў таксама не было заган да яго. Лекарскае пасведчанне кандыдата не давала проціпаказанняў для гэтай функцыі. Уладзіслаў Камарчук задавальняў усе фармальныя патрабаванні закону.

Уладзіслаў Камарчук з'яўляецца вельмі сімпатычным і сціплым чалавекам, адкрытым і гаваркім, спрактыкаваным у жыццёвых справах. А такімі менавіта якасцямі павінны валодаць народныя засядацелі. І яшчэ адно фармальнае патрабаванне: засядацель павінен мець не менш трыццаці гадоў і не больш сямідзесяці.

Уладзіслаў Камарчук нарадзіўся ў 1940 годзе ў Гайнаўцы, у каталіцкай сям'і. Жанаты, мае сярэднюю агульную адукацыю. Пасля выхаду на пенсію вярнуўся ён у сямейную Орлю (жонка асталася ў Беластоку), куды цягнула яго прага да роднага, беларускага. Пасля адыходу ад „Арлян" саліста Мікалая Лопуха, Уладзіслаў Камарчук паспяхова пераняў ягоную ролю. І, як сам сцвярджае, праца ў арлянскім калектыве ўзбагачае ягонае асэнсаванне жыцця.

Фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Уладзіслаў Камарчук: — Мо некаторым не даспадобы, што адзяваю беларускую кашулю

Людзям падабаюцца песні ў выкананні Владка — так яго тут называюць. Бывае, што просяць яго праспяваць нешта ў камерным коле. Магчыма, што гэта такая туга па мінулым, калі людзі самі прыпявалі на лавачках; зараз гэты звычай звёўся.

Аднак здараюцца ў нас і такія, што варожа адносяцца да мастака. У адну сёлетнюю ліпеньскую ноч невядомыя буяны напалі на яго на ягоным панадворку і пабілі без дай прычыны так, што трапіў ён у шпіталь. Гэтая хуліганская вылазка паказвае, што ў нашых вёсках не так спакойна і бяспечна, як прынята паўсюдна думаць. Вечарамі трэба быць напагатове!

На адной з рэпетыцый „Арлян" я спытаў у Владка Камарчука, што адчувае чалавек, да якога радныя паставіліся з недаверам.

— Хаця маю кандыдатуру падтрымалі шасцярых радных, прыкра. Частка нашага самакіравання паказала, што ставіцца да мяне непрыхільна. Ведаю, што за гэтым была інтрыга адной раднай. Можа некаторым членам Гміннай рады перашкаджала мая частая прысутнасць на пасяджэннях рады, мая цікавасць да гмінных спраў. Падаючы засядацельскую заяўку, думаў я дапамагаць людзям сваімі ведамі і вопытам у вольны час, без карыслівага разліку. Магчыма, што некаторым не даспадобы тое, што я апранаюся ў народную беларускую кашулю, што я не цураюся сваёй беларускасці, — сумна разважае спадар Камарчук.

* * *

А як выглядала праца народнага засядацеля ў мінулым тэрміне? — спытаў я аднаго з былых засядацеляў ад Арлянскай гміны.

— На працягу майго тэрміну на разгляд судовых спраў клікалі мяне рэдка, — адказаў ён мне, — крыху больш за дзесяць разоў. Мяркую, што часцей клікалі сваіх, з Бельска. Мы павінны былі ўдзельнічаць у разглядзе сямейных спраў, але на практыцы бывала інакш. Аднойчы паклікалі мяне на справу, якая аказалася крымінальнай — разглядалася насілле. Віноўнікі, брытыя бамбізы, з'явіліся ў зале ў вясёлым настроі. Пасля гэтага адхацелася мне засядацельства. Не хачу гэтых камандзіровачных (50 злотаў), не хачу рызыкаваць, хвалявацца...

— А ці такі засядацель можа мець істотны ўплыў на ход справы? — пытаю далей.

— Ніякага ўплыву ён не мае, бо сваё меркаванне, калі яно іншае чым суддзі, трэба самому пісьмова абгрунтаваць. А хто з засядацеляў умее гэта напісаць? І, мяркую таксама, калі б засядацель адстойваў сваё, яго б пасля на справы не клікалі.

Не здзіўляюся, што на новы тэрмін не было ахвотных з Арлянскай гміны. Але здзіўляе мяне тое, што адзінага ахвотнага, які задавальняў усе патрабаванні, радныя адкінулі.

Культура ў Орлі

Размова з выконваючай абавязкі дырэктара Гміннага асяродка культуры ў Орлі Аннай ФІЁНІК.

— ***Якія галоўныя мерапрыемствы праводзіць у гадавым маштабе Ваш асяродак?***

— Фэст беларускай культуры „Арлянскія сустрэчы" ў верасні, які сёлета супаў са святкаваннем 500-годдзя Орлі. У гэтым годзе ўзбагачаны ён быў гістарычнай канферэнцыяй ды адкрыццём фотавыстаўкі „Z synagogą w tle". У мастацкай частцы выступілі нашы калектывы „Малінкі", „Арляне", маладзёжны „Fermata" ды дзіцячы „Арлянскія званочкі". Апрача іх радавалі нашу публіку „Прымакі" і „Ас" з Беластока, „Каліна" з Залук, чыжоўскія „Чыжавяне", „Фэст" з Баранавіч, „Omen" з Міхалова ды „Цыганскія чары" з Варшавы. Свае вырабы прэзентавалі на фэсце майстры рукадзелля з нашай гміны, якія паказалі гаршкі, кветкі ды вырабы з саломы. Крыстына Грыгарук з Орлі паказала адмысловыя вырабы з паперы.

Штогод у маі ў Маліннікох ладзім „Рагулькі". Сёлета, 17 лістапада, у Пашкоўшчыне была адкрыта адрамантаваная вясковая святліца. У калядны час арганізуем вячэру для адзінокіх, у час якой з мастацкай часткай выступаюць дзеці, што займаюцца ў нас і ў школе. Калі пажылыя жыхары нашай гміны адзначаюць юбілеі, тады таксама дзеці прэзентуюць сваё майстэрства. І ў „Андрэйкі" ладзім забаву.

— ***Ці Ваш асяродак праводзіць мастацкія адукацыйныя заняткі?***

— Музычныя заняткі раз у тыдзень праводзіць Мікалай Фадзін з Гродна. Дзеці вучацца ігры на цымбалах, акардэоне, флейце. Моладзь займаецца ў брыджавым гуртку.

— ***Якімі памяшканнямі карыстаецца Ваш асяродак?***

— У Орлі маем толькі вельмі цесныя памяшканні Гміннага асяродка культуры. Пад нашаю апекай мясцовая бажніца, якою таксама можам карыстацца. Вось і згаданая фотавыстаўка наладжаная там Таварыствам прыяцеляў Арлянскай зямлі.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

— ***А па вёсках святліцы ёсць?***

— Ёсць — яны пад апекай салэцкіх рад і тамашняй моладзі. Ёсць святліцы ў Кашалях, Шарнях, Пашкоўшчыне, Маліннікох, Градалях, Рыгораўцах, Дыдулях, Крывятычах, Міклашах і Рудутах.

— ***Якія мастацкія калектывы працуюць у Вашай гміне?***

— Гэта „Арляне", якія праводзяць рэпетыцыі прынамсі раз у тыдзень. У калектыве дзесяць чалавек, займаецца з імі Мікалай Фадзін.

У вакальным калектыве „Fermata" займаецца васьмёра ліцэістаў і гімназістаў: апякуецца імі Ірэна Трафімюк. Пад ейнай апекай таксама дзіцячыя „Арлянскія званочкі". Да гэтага трэба дадаць мастацкія вакальныя і танцавальныя заняткі, якія праводзіць наш комплекс школ. „Малінкі" з Маліннік налічваюць сем асоб; кіруе імі Вера Нічыпарук.

— ***Ці ў абсягу дзейнасці Вашага асяродка ёсць захаванне спадчыны, напрыклад, архітэктурнай?***

— Не, гэтым наш асяродак не займаецца.

— ***А можа прамоцыяй гміны?***

— Таксама не. Нашы сродкі вельмі сціплыя і нашы магчымасці вельмі абмежаваныя. У памяшканнях Гміннага асяродка культуры маем тры інтэрнэтныя тэрміналы. Ахвотныя могуць скаратаць час за брыджам ці більярдам.

— ***Дзякую за размову.***

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Каб помнілі і ведалі

Леакадзія МІЛАШ

Праходзяць гады, усё далей аддаляюцца 1980-я, калі пачало адраджацца беларускае жыццё пасля пяцідзесяцігадовага перапынку. Яго пачыналі нашчадкі беларускай інтэлігенцыі пачатку XX стагоддзя — браты Лявон і Юрка Луцкевічы, Лявон Кароль, Хведар Нюнька. Сярод іх быў Мікола Рулінскі — вучань легендарнай Віленскай беларускай гімназіі. Ён браў актыўны ўдзел у розных беларускіх імпрэзах, меў добры голас, у міжваенны перыяд спяваў у царкоўным хоры ў Пятніцкай царкве, пазней — у Свята-Духавым манастыры разам з братам Зміцерам Рулінскім. Мне пашчасціла пазнаёміцца з Міколам у 1985 годзе і сяброўства доўжылася да апошніх дзён яго жыцця. Сустракаліся мы часта, жылі па адной вуліцы. Калі я прыходзіла да яго, ён спяваў „Мы выйдзем шчыльнымі радамі" — любімую песню яго маладосці, „Магутны Божа", якая стала гімнам беларусаў Вільні, „Ой, Нёман", чытаў вершы Янкі Купалы. Ад яго я ўпершыню пачула пра эскадрон Барыса Рагулі, у якім служыў Мікола Рулінскі. У 1997 годзе ў Вільні адбылася рада БНР, праз шмат гадоў сустрэліся былыя рагулеўцы ў гістарычнай Вільні. Барыс Рагуля прыляцеў з Канады. Тады ён наведаў і сям'ю Міколы Рулінскага. Старшыня Таварыства беларускай культуры ў свой час некалькі разоў прапаноўваў зняць відэафільм пра Міколу Рулінскага і Кастуся Шышэю. Адкладвалі на пасля, баяліся, бо абодва адбывалі пакаранне ў сталінскіх лагерах за тое, што былі шчырымі беларусамі. 9 лістапада па Беларускім тэлебачанню паказалі фільм „Преступление века" пра рагулеўца Цімафея Баршчэўскага, які дажывае свой век у Гомелі. Тое, што зрабіла з чалавекам сістэма, вельмі страшнае. Яго паказваюць як злачынцу века, хоць ужо і XXI стагоддзе. Вось, што значыць жыць у Беларусі. Цяпер я разумею Міколу Рулінскага, які бясконца гаварыў каб не пашкодзіць родзічам, якія жывуць у Беларусі. Ён нават не рэабілітаваны, не палічыў гэта патрэбным.

Няма ўжо сярод нас ні Кастуся Шышэі, ні Міколы Рулінскага. У кастрычніку споўнілася 5 год, як Мікола Рулінскі адышоў у іншы свет. У ТБК адбыўся вечар яго памяці — успамінамі падзяліліся тыя, хто яго ведаў. Ён меў не толькі добры голас, а яшчэ пісаў вершы, маляваў краявіды, займаўся фатаграфіяй, граў на гітары. На мерапрыемстве былі паказаны фотаздымкі: сустрэча былых вучняў ВБГ, рада БНР, мерапрыемствы ў ТБК, у якіх удзельнічаў М. Рулінскі. Яго пахавалі як героя і на яго магіле заўсёды ляжаць бел-чырвона-белыя кветкі.

Адзначылі і чарговыя ўгодкі з дня нараджэння яшчэ аднаго беларускага патрыёта — Мар'яна Пецюкевіча, этнографа, вучонага, грамадскага дзеяча, асобу, якая шмат зрабіла для беларускай культуры.

У выдавецтве ТБК выйшла шмат кніг М. Пецюкевіча. Ды і да гэтага мерапрыемства рыхтаваліся загадзя — улетку актывісты таварыства, на чале са старшынёй, здзейснілі вандроўку на азёрную Браслаўшчыну, наведалі краязнаўчы музей, у якім знаходзяцца экспанаты, кнігі М. Пецюкевіча, пабывалі ў вёсцы Цяцеркі, у якой ён нарадзіўся, сустрэліся са старэйшай жыхаркай, якая помніла М. Пецюкевіча, зрабілі фотаздымкі. Пра яго жыццё і дзейнасць гаварылі Леакадзія Мілаш ды Хведар Нюнька. У сядзібе ТБК дзейнічае выстава яго кніг, фатаграфій з сустрэчы з яго дачкой Марыляй Пецюкевіч. На мерапрыемстве прысутнічаў і сын Галіны Антонаўны Войцік-Луцкевіч. Ён перадаў таварыству бюст Івана Луцкевіча, каштоўныя дакументы Мар'яна Пецюкевіча (дыплом універсітэта, фатаграфіі, лісты Марылі Пецюкевіч да Зоські Верас). Іх перададуць у Браслаўскі музей.

Гэтым разам адзначылі і ўгодкі з дня нараджэння „вечнага вандроўніка", мастака Язэпа Драздовіча і ўжо пачалі рыхтавацца да 110-годдзя. Падчас вандроўкі на Браслаўшчыну наведалі магілу мастака ў вёсцы Ліпляны, яго маці ў вёсцы Германавічы, наведалі адзіны музей Язэпа Драздовіча, сустрэліся з заснавальніцай музея Адай Райчонак, краязнаўцам К. Кажаном. Ён правёў экскурсію па музеі. Праехалі Шаркаўшчыну, Глыбоччыну (гэтыя мясціны мастак абышоў пешшу). Экскурсію вёў Алесь Адамковіч, які на мерапрыемстве расказваў пра Я. Драздовіча, паказаў фільм „Зорны шлях" (адзін з аўтараў фільма — А. Адамковіч). Да Драздовіча едуць і беларусы Вільні. Яго лёс і жыццё звязаны і з нашым горадам — усе ведаюць скарынаўскі знак на Дамініканскай вуліцы. Яго абаранялі беларусы-віленчукі, каб захаваць для нашчадкаў, калі рамантавалі будынак. У апошняй кнізе „Свабода да апошняга дыхання" пісьменніца Вольга Іпатава так піша пра Язэпа Драздовіча: „Ёсць пра што гаварыць, паказваць, абвяшчаць свету. Яго вобраз і творчасць уздымаюць усіх нас, беларусаў. Я веру, што мы дачакаемся новых фільмаў пра Творцу, які ўсё жыццё жыў так, як тварыў — свабодным".

Пра гэтых беларускіх творцаў гаварылі на мерапрыемстве ў Таварыстве беларускай культуры ў Вільні. Да месца апошняга спачынку на могілках Росы і Ліпоўцы кожны год прыходжу з вучнямі на Дзяды і Радуніцу, каб ведалі і помнілі. З гэтай мэтай ладзяцца і ў ТБК такія мерапрыемствы, бо да нас прыходзіць моладзь, студэнты Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта, школьнікі і тыя, хто цікавіцца беларускай гісторыяй.

Добры прыклад

У 46 нумары „Нівы" ад 18 лістапада друкаваўся допіс Тодара Ліпскага „Цукеркі замест гарэлкі", у якім аўтар паказвае як навучэнцы профільнага класа Міністэрства па надзвычайных становішчах СШ № 1 у г. Маларыце праводзяць акцыю „Дзеці супраць алкаголю". Гэтай арыгінальнай ідэяй з-за мяжы, на маю думку, павінны пацікавіцца нашы няўрадавыя арганізацыі і школы ды распаўсюджваць яе сярод грамадства. Паталагічныя звычкі курэння і злоўжывання алкагольнымі напіткамі прыносяць вялікі ўрон здароўю і сямейнаму бюджэту.

Вышэйпрыведзеная супрацьалкагольная акцыя ў Беларусі не з'яўляецца адасобленым прыкладам вартым пераймання. Хачу паказаць іншы прыклад, які тычыцца аўтобусных прыпынкаў. Калі падарожнічаў я ў Камянец, Брэст ці вандраваў па прыгранічнай зоне, бачыў гэтыя месцы акуратна задбанымі. Прыпынкі там шыкарна памаляваныя, на кожным лавачкі для сядзення, а навокал чысціня і парадак. **(ус)**

Пакалечаныя дрэвы

Каб нацешыць вока прыгажосцю дрэў неабходна пайсці ў лес або ў парк. Толькі рэдкія экземпляры харошых асталіся ў нашых вёсках. А яшчэ не так даўно паабапал вясковых вуліц раслі стройныя дрэвы, спецыяльна падабраных парод. А як зараз? Дык вось стаяць слупы вулічнага электраасвятлення і дзеля іх дрэвы калечаць — ссякаюць верхавіны або галіны. І дрэвы стаяць брыдкія, з куксамі. Яны прайгрываюць з дратамі, у якіх плыве электрычны ток. Электралінія мае перавагу над дрэвамі, дзе б яна не была.

Ажно прыкра глядзець на дрэвы-чучалы побач вуліц у вёсках ды дарог. Так ёсць м.інш. у Новым Ляўкове. Па вуліцы ў Старым Ляўковае амаль усе дрэвы ўжо высеклі. У Нараўцы — не інакш. Такая вось цана цывілізацыі. **(ян)**

Суседская сустрэча

Віктар БУРА

У суботу, 17 лістапада 2007 года, каля магазіна „Бядронка" ў Гайнаўцы спыніўся аўтобус. Пагрузіліся ў яго 40 гайнаўскіх пенсіянераў, якія падаліся ў Белавежу, дзе мясцовы пенсіянерскі гурток ладзіў сустрэчу з членамі калектыву „Чырвоная гваздзіка" з Пружан на Беларусі.

Нашу дэлегацыю пры пажарным дэпо, у якім праходзіла вечарына, прывітала старшыня гуртка пенсіянераў і інвалідаў у Белавежы Аліна Цівоньчык. Вялікая зала памалу пачала напаўняцца ўдзельнікамі вечарыны. Прыбылых гасцей з Беларусі сардэчна прывітаў войт Белавежскай гміны Альберт Літвіновіч, які сказаў: «Вельмі добра, што адбываюцца сустрэчы з суайчыннікамі, якія жывуць у блізкім замежжы. Вельмі нам патрэбна сутыкнуцца з культурай нашай Бацькаўшчыны, якую нам прывезлі члены калектыву „Чырвоная гваздзіка"». У сваю чаргу кіраўнік калектыву Валянціна Карабко сказала: „Любові да песні, жаданню быць вечна маладым усе ўзросты падуладны. Песні, якія выконваюць члены нашага калектыву, падрыхтаваныя ў Палацы культуры ў Пружанах. Наш калектыў ахвотна прыняў запрашэнне наведаць нашых сяброў у Гайнаўскім павеце. Прыемна, што наш брат і тут, і там у пашане". Душа вечарыны Аліна Цівоньчык адзначыла, што „дрэнная справа змарнаваць маладосць, але ўжо зусім недарэчна змарнаваць старасць". Дадала яна яшчэ, што такія сустрэчы вельмі патрэбныя пенсіянерам Пружан, Гайнаўкі і Белавежы. Яе словы сабраныя прынялі бурнымі апладысментамі. Затым голас узяў старшыня Саюза пенсіянераў і інвалідаў у Гайнаўцы Мікалай Чыквін, які сказаў: „У палякаў і беларусаў ёсць агульнае духоўнае багацце, якое трэба берагчы і мацаваць. Таму трэба даражыць сваімі сувязямі паміж нашымі народамі, шчодра дзяліцца сваімі ведамі, народнай творчасцю, актыўна ўдзельнічаць у мерапрыемствах, ладжаных ветэранамі вайны і працы Пружан ды пенсіянерамі Гайнаўкі і Белавежы".

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Старшыня Гайнаўскага аддзела Саюза польскіх пенсіянераў і інвалідаў Мікалай Чыквін уручае кіраўніку калектыву „Чырвоная гваздзіка" з Пружан Валянціне Карабко падарак — гадзіннік. На другім плане (злева направа): старшыня гуртка пенсіянераў у Белавежы Аліна Цівоньчык, войт Белавежскай гміны Альберт Літвіновіч і віцэ-старшыня Гайнаўскага аддзела Саюза польскіх пенсіянераў і інвалідаў Эдуард Бай

Прыйшоў час афіцыйнага абмену падарункамі, якія падрыхтавалі абодва бакі сустрэчы і ўручалі пад воплескі „пажылой моладзі". Пры тым прагучэлі ўзнёслыя словы, якія ўзрадавалі ўсіх прысутных і паднялі настрой.

Белавежскія пенсіянеры запрапанавалі мастацкую частку ў выкананні вучняў мясцовага Лясного тэхнікума. Сільвія Яблонская і Агата Градзіцкая спявалі пад гітарны акампанемент Евы Аруські і Габрыелі Сталеўскай. А вершы дэкламавалі Агнешка Кавалеўская і Караліна Дацкевіч. Групу да выступлення падрыхтавала настаўніца Крыстына Дацкевіч. Вучаніцы пажадалі сабраным доўгага жыцця і моцнага здароўя, на што пенсіянеры адрэагавалі бурнымі апладысментамі.

За багаты стол села больш за сто прыгожа апранутых людзей старэйшага ўзросту. У міжнароднай кампаніі паплылі цікавыя размовы, завязаліся новыя знаёмствы. Нам, гайнавянам і белавежцам, цікава было пачуць як жывуць звычайныя людзі ў Беларусі. Наша група зрабіла такі вывад: сябрам з-за мяжы жывецца зусім добра. У іх неабходнае матэрыяльнае і тэхнічнае забеспячэнне. Мы адчулі, што нашы землякі з Пружан гаварылі пра сваё становішча абсалютна бескарысна і шчыра, прыводзілі шэраг канкрэтных прыкладаў сваіх поспехаў і дасягненняў. Мы многа даведаліся пра Беларусь, бо ў нашай краіне пра яе пішуць мала і найчасцей адмоўна.

Паплылі песні ў выкананні нашых самадзейнікаў, папулярныя ў іх маладосці, між іншым, „Дзе някошана трава", „Белым снегам", „Upływa szybko życie", „Кацюша". Затым пачаліся танцы, да якіх падыгрываў і спяваў музыкант Саладуха з Гайнаўкі.

Пакідаючы Белавежу нашы госці гаварылі, што ім вельмі ўсё спадабалася, што часцінкі сваіх сэрцаў пакідаюць яны тут, у Белавежы і Гайнаўцы. І мы ім верым ды дзякуем за супольна праведзены вечар. Мы з імі намнога гадоў душэўна памаладзелі. Трэба, каб так было заўсёды.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

„Беларус у Еўрасаюзе"
— частковае падвядзенне вынікаў фота-конкурсу

Дарагія сябры! Многія з вас чакаюць вынікаў фатаграфічнага конкурсу „Беларус у Еўрасаюзе", які распісалі мы ў пачатку 2007/2008 школьнага года. Прыгадайма: нас цікавіў ваш індывідуальны погляд на працэс, вашы заўвагі, назіранні або каментарый да названай тэмы. Героямі маглі быць вашы сябры, вы самі, вашы суседзі, сваякі, бацькі... (адна падказка — нас не цікавілі вашы падарожжы па экзатычных краінах!). Кожная фатаграфія павінна была мець подпіс не большы за адзін сказ. У конкурсе прыняло ўдзел сем удзельнікаў — чатыры дзяўчыны і трох хлопцаў ва ўзросце 12-17 гадоў.

Вашы здымкі ацэньвалі **фатографы Міхал Косць, Павел Гжэсь і мастак-дызайнер Міраслаў Здрайкоўскі**. Журы звярнула ўвагу на чатыры працы. Астатнія — як згодна сцвярджаюць члены журы — былі штучна падцягнуты пад тэму конкурсу.

Павел Гжэсь найвышэй ацаніў працы беластоцкай ліцэісткі Евы Сегень:

— Фоткі Евы здаюцца мне найбольш дапрацаванымі так у форме, як і ў змесце (аднак без здымка н-р 2). Відаць, што дзяўчына шукае свайго месца ў рэчаіснасці, не пагаджаецца з усімі, ды спасылаецца на вядомыя аўтарытэты. Мне здаецца, што Ева найцікавей прадставіла конкурсную тэму з усіх удзельнікаў. Бачу цалкам добрую працу з кадрам вобразу, як і адчуванне эстэтыкі.

Ева Сегень — „Коласу слава, слава Купалу, а дзе месца Табе"

Другое месца фатограф прапануе **гімназістцы Ганне Пякарскай з Юроўцаў**, якая адсланяе аблічча беларускай моладзі ў Еўрасаюзе.

— Бачым, што ёсць у ёй энергія і харызма. З аднаго боку паказвае захапленне матэрыяльнымі навінкамі заходняга свету, з другога — шчырае будаванне свайго свету і пачуццё крышталізацыі нейкай канкрэтнай візіі. Гэта можа надта моцныя словы, — кажа Павел Гжэсь, — але, думаю, што гэта нармальная з'ява, калі маладыя людзі сучасны складаны свет хочуць называць па-свойму.

Мастак Міраслаў Здрайкоўскі ў сваю чаргу найвышэй ацаніў конкурсныя здымкі **Марціна Кандрацюка з Нараўкі:**

— Калі я пераглянуў фоткі, адразу ведаў каму прызначыць першае месца. Суцэльнасць тэмы — беларус у Еўрасаюзе — прыгажосць гэтай фоткі ў яе праўдзівасці, прастаце, без позаў, без непатрэбных рэквізітаў. Усё ясна. Праўда пра беларусаў спакойная, чорна-белая старасць і любоў да зямлі.

Мастак сцвярджае, што ўразіла яго сітуацыя беларускай літаратуры на Падляшшы — бо такое пытанне ставіць **Ева Сегень**. Ці яе месца далей астанецца ў падзямельным пераходзе? Аўтар кніжак для нашых дзяцей хацеў бы, каб іх чыталі дзеткам у кожнай беларускай хаце — але ці так яно ёсць? Ці астануцца яны ў запыленых, музейных бібліятэках?

Цікава, што ўсе прыкмецілі працы наймалодшага ўдзельніка **Ігара Карнілюка з Супраслі.**

Павел Гжэсь: — Тут бачым як еўрапейка вяртаецца да бабулі і дзеда ў вёску. Тым самым паказвае дзе яе (і ўсіх падляшскіх беларусаў) карані. Добра, што ўжо ў такім узросце ёсць пашана для падставовых элементаў нашай простай культуры, але без гэтага немагчыма свядома існаваць і дзейнічаць у Еўропе.

Міраслаў Здрайкоўскі бачыць у здымках Ігара больш аптымістычны погляд на беларуса ў Еўрасаюзе. Ён самы багаты і шчаслівы ў Новай Вялікай вёсцы, якую завуць Еўропай. Ці дзе-небудзь ёсць яшчэ такія смачныя стравы як у бабулі ў вёсцы? Такая смачная каўбаска з пірагом?!

Пра ўзнагароды і канчатковае падвядзенне вынікаў напішам у наступным нумары „Зоркі".

Ігар Карнілюк — „Еўрапейка едзе ў вёску"

Марцін Кандрацюк — „А зямля такая самая"

Вершы Віктара Шведа

Ці гэта жабця?

У пярэдняй знянацку
Раздаўся тэлефонны званок.
Падняў раптам трубку бацька
Трох дарастаючых дачок.

— Ці гэта мілая жабця? —
Пачуў ён голас цікавы.
— Не, гэта толькі папця,
Уласнік цэлага ставу.

Кампраміс

Тату запытаў Барыс:
— Прашу, скажы мне татка мілы,
Што гэта слова кампраміс,
Настаўніца аб тым прасіла.

— Футра матуля хоча мець,
А я машыну з-за мяжы.
Пальто купілі маме ледзь,
Яно вісіць у гаражы.

Вікторыя Семашчук, 12 гадоў. Першая сустрэча Барбары і Жыгімонта Аўгуста. „Гэта наша гісторыя", Мінск 2006.

Музыка з кайфам

Ліцэйскі гоман

Бывае так, што часам паяўляюцца з'явы, якія хутка знікаюць, але калі дастаткова ў іх дэтэрмінацыі, удаецца пакінуць ім па сабе важны ўспамін.

Так у скарачэнні можна прадставіць гісторыю аднаго з нямногіх беларускіх рок-гуртоў, якія існавалі ў Гайнаўцы.

http://ehoman.webpark.pl

Праўда, так можна сказаць пра ўсе неіснуючыя беларускія гурты, пра якія буду распавядаць, але таму, што гэта першая гісторыя, захаваная толькі ў памяці, на здымках і ў паперах, таму пачынаю так патэтычна.

„Гоман" гэта гурт заснаваны ў 1997 годзе аднагодкамі (Марцін, Кароль, Павел і Томэк), якія пачалі вучобу ў Гайнаўскім беларускім ліцэі. Мала хто ведае, што пачаткова, калі вакалісткай была Кася Сапяжынская, гурт называўся „Банан", а нават „Казакі". Не ведаю ці гэта таму, што першымі творамі былі каверы на фальклорныя песні, якія звычайна спяваліся пры вогнішчах, напрыклад, „Касіў Ясь", ці першая ў гісторыі гурту песня „Чом ты нэ прышоў". Калі на месца Касі разам з новай назвай прыйшла Ілона Карпюк, пачаўся зусім новы перыяд. Дапамагалі ў гэтым таксама вельмі добрыя ўмовы працы. Гурт меў на свае патрэбы асобнае памяшканне, а інструменты, дзякуючы якім можна было ўвогуле думаць пра гурт, школа атрымала ў спадчыну па гурце „Дубівішчы", а таксама сваю творчасць двойчы запрэзентаваць на „Бардаўскай восені". Нельга абысці маўчаннем уклад Стэпа ў развіццё дзейнасці гайнаўскай моладзі. Дзякуючы яму ўдалося выступіць і на беластоцкіх сцэнах — у клубе „Хата Пухата" (восень 2000), ці ў рамках „Дзён Беластока" ў кінатэатры „Форум" (чэрвень 2001). Апошняя песня гурту — „Назаўсёды" — прэзентавалася ў гайнаўскім амфітэатры ў час кароткага выступу і то перад польскай зоркай Касяй Кавальскай (ліпень 2001). Песня настолькі спадабалася „гоманаўцам", што стала загалоўкам касеты, якую запісаў Стэп на студыё Радыё „Рацыя". Такім чынам „Гоман" перайшоў пэўна ў гісторыю „назаўсёды".

http://ehoman.webpark.pl

i_basovka@o2.pl

ГІСТОРЫЯ ПРА НЯМОЕ КІНО

Ведаеце, што такое нямое кіно? Вось і ў тым мястэчку, пра якое пойдзе мая гаворка, таксама не ведалі. Пакуль туды тое самае нямое кіно не прывезлі. У старэнькі кінатэатрык, вядомы на ўсё мястэчка. Вядомы баевічкамі, трылеркамі, усялякай фантыста-мультыстыкай. А тут — вось дык справа! — нямое кіно!

І ніхто на яго, можна сказаць, не пайшоў. Акрамя невялікай дзяўчынкі з вельмі вялікімі вачыма. Толькі ейныя вялікія вочы чамусьці адразу не заўважылі яшчэ аднаго гледача — такога ж невялікага хлопчыка з такімі ж вялізнымі вачыма. А вось ён...

Але не будзем, аднак, забягаць наперад.

А ціха сядзем побач з дзяўчынкаю, уважліва паглядзім: што ж там, на шырокім белым экране? Ну як, бачыце? Вось і я таксама. Ясная справа — надта старое кіно... Старое, нямое, яшчэ і стужка рвецца! Прычым, здаецца, у самым цікавым месцы.

Звычайна ўсе зыходзяць прэч, калі такое здараецца. А тут!..

Дзяўчынка сядзіць, хлопчык сядзіць..., ды не проста сядзіць — а ўсё бліжэй, усё шчыльней; ужо і подых чутно над вушкам, ужо і сядзіць ён не побач, а насупраць, насупраць!.. Так, насупраць: вочы ў вочы, доўга, уважліва, неадрыўна.

І далей — не трэба ўжо аніякіх слоў.

І глядзелі яны, доўга глядзелі ў вочы адзін аднаму, даглядалі сваё нямое кіно, і было тое кіно — пра каханне.

Толькі штосьці фінал не надта ім падабаўся. Тады вырашылі яго перазняць і зрабілі спачатку першы нясмелы дубль. А потым яшчэ адзін, яшчэ, яшчэ і яшчэ...

Даўно ўжо скончылася старое нямое кіно ў маленькім кінатэатрыку слыннага таго мястэчка. Толькі чамусьці дасюль не запальваецца там святло, і дасюль хлопчык з дзяўчынкаю здымаюць нескончальны апошні дубль ці то першага, ці то апошняга свайго пацалунка...

Ваш Дзядзечка Сід

20 кастрычніка 2007 г., Кобрын

Польска-беларуская крыжаванка № 48



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 44: Сто, Кіпр, вета, прапанова, расол, Ас, цар, гарт, трус, баба, лістапад. Стол, Кіпр, праца, краса, порт, авал, губа, сто, асад, тавар, астра.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Аня Каліноўская, Ева Карольска, Іза Васілюк, Магда Місяюк** з Чыжоў, **Паўліна Лук'янюк** з Нарвы, **Аня Ягадніцкая, Лукаш Стэпанюк** з Гайнаўкі. Віншуем!

Беларуская асвета ў Еўрасаюзе (4)

Ганна КАНДРАЦЮК

Калі я спытала, які будынак займае віленская беларуская школа, мне патлумачылі: у гэтым будынку раней быў дзіцячы садок.

— Ды чым ён характэрны?

— Нічым, — маё пытанне выклікала здзіўленне, — усе савецкія садкі выглядаюць ідэнтычна!

Тое, што я пабачыла на месцы, выглядала змрочна і прыгнятальна. Школа патрабуе грунтоўнага рамонту. Доўгі час я мазгавала наконт сэнсу стэнда з прыгажуняй у саламяным вянку (ды прозвішчам Францішка Скарыны) ля ўвахода ад вуліцы. Прыходзіў толькі адзін адказ: „Мабыць, каб адвесці вочы ад заняпаду, у якім апынуўся школьны комплекс!"

Сама школа прасторная, з вялікай колькасцю памяшканняў і неабходным абсталяваннем. Ёсць сталовая, святліца, кабінеты, музей. Праўда, віленчукі, якія маюць у памяці даваенны беларускі музей у Базыльянскіх мурах (сярод экспанатаў былі, між іншым, арыгінальныя выданні Францішка Скарыны, слуцкія паясы), прэстыжнасць школьнага музея вызначаюць у адным сказе: „Там жа няма і аднаго арыгінальнага экспаната!"

Пасля ўваходу ў школьны будынак настрой мяняецца „на плюс". У адкрытых залах, якія спалучаюць калідоры-лабірынты, шмат дэкаратыўных раслін, экалагічныя экспазіцыі, малюнкі школьнікаў, карцінная галерэя. Маецца ўражанне ўтульнасці, свойскасці. Праўда, абсталяванне тут сціплае і далёка несучаснае, аднак дагледжанае старанай рукой. Чамусьці адразу мне схацелася спытаць пра канкурэнцыю:

— А колькі ў Вільні польскіх школ?

— Яна Паўла, Сыракомлі, гімназія Адама Міцкевіча, — пералічвае ў памяці, пакуль не назаве ўсіх, спадарыня Леакадзія Мілаш. Лік польскіх школ у самой сталіцы застаўляе з прызнаннем думаць пра тамашніх палякаў не больш, чым пра рускіх. У Вільні аж сем польскіх школ, а рускіх амаль удвая больш — іх трынаццаць. Ёсць яшчэ яўрэйская школа.

— Габрэйская невялікая, але яна, канешне, добра абсталяваная, — адзначае настаўніца.

Менш шчасця за беларусаў маюць адны ўкраінцы, у якіх працуе толькі нядзельная школа. Затое ў іх карыстанне гарадскія ўлады перадалі Свята-Троіцкую царкву, што ў славутых Базыльянскіх мурах.

* * *

З якіх сем'яў выводзяцца навучэнцы беларускай асноўнай і сярэдняй школы? Цікава, што прыблізны лік вучняў у класе — 10 асоб — сустрэнем не толькі ў Вільні, але і ў Беластоку ды Рызе. Дарэчы, лік беларусаў у Літве (43 тысячы) прыблізны як і ў нас (48,7 тысяч).

— Спачатку, — кажа Леакадзія Мілаш, — аснову складалі дзеці беларускай інтэлігенцыі: журналістаў, настаўнікаў, дзеячаў арганізацый. Ну і звычайных беларусаў, словам — усіх тых, для каго неабыякавыя беларуская мова і гісторыя. Зараз, апрача беларусаў, вучацца расіяне, палякі, дзеці са змешаных сем'яў. Ды не толькі з самой Вільні. Прыязджаюць сюды школьнікі з Салечнік, Кайдышак, Грыгішак, з Новай Вільні...

фота Ганны КАНДРАЦЮК

Настаўніца Алена Базюк

— А на якой мове выкладаюцца прадметы?

— У асноўным на беларускай. Частка выкладаецца на літоўскай — гэта фізкультура, фізіка, гісторыя і геаграфія Літвы ды, канешне, літоўская мова, якой адводзіцца 5 гадзін у тыдзень.

Паколькі мая субяседніца — русістка, пытаю ў яе пра месца і ранг рускай мовы. Адказ шакіруе, паколькі на калідоры і ў настаўніцкім пакоі я чула толькі мову Пушкіна.

— Руская мова выкладаецца ў нас як прадмет, дзве гадзіны ў тыдзень. Адкуль тады такая асіміляцыя ў рускі бок? Адказ адзін — з Беларусі, — настаўніца кажа, што ўсе іхнія выпускнікі, якія пайшлі вучыцца ў Мінск, не гавораць па-беларуску.

* * *

Хоць не было яшчэ абеду, у школе доўга шукалі настаўніцу беларускай мовы. У мяне склалася ўражанне абыякавасці да сустрэчы. Але спадарыня Леакадзія зрабіла ўсё, каб я не хвалявалася. Пасля 15-хвіліннага чакання ў калідоры я мела магчымасць пагутарыць з беларусісткай Аленай Базюк.

— Вы з Польшчы? — пацікавілася спачатку настаўніца. Як дагадалася? Па акцэнце.

— Я сама з Гродзеншчыны, — кажа спадарыня Базюк.

У Вільні яна апынулася па сямейнай прычыне. З перспектывы Вільні — мы суседзі-аднапляменніцы. Настаўніца ўспамінае сяброўак-настаўніц з Беласточчыны, з якімі пабывала на курсах у Мінску.

У беларускай школе працуе ад пачатку.

— А паводле якой праграмы, — пытаю, — Вы выкладаеце беларускую мову?

— У нас свая праграма, — інфармуе настаўніца, — яна дапасаваная да літоўскіх стандартаў. Проста, у нас другі менталітэт ды свая багатая спадчына. Мы засяроджваемся на творах віленскіх аўтараў, такіх як Максім Гарэцкі, Якуб Колас, Янка Купала, Казімір Сваяк, Цётка, Зоська Верас, Максім Багдановіч, Наталля Арсеннева. Ладзім экскурсіі па месцах, звязаных з беларускай культурай і гісторыяй.

— Дык чаму ніхто з Вашых выхаванцаў не прыйшоў на адкрыццё іх мемарыяльных дошак?

— Бо ў нас была накладка. Мы рыхтаваліся да канцэрта, праводзілі рэпетыцыі...

Мерапрыемства, дзень пазней, ладзіла беларуская амбасада.

* * *

А якую дапамогу школа атрымлівае ад Рэспублікі Беларусь?

— Дапамагаюць нам падручнікамі, — кажуць настаўніцы.

Пытаю яшчэ пра мікрааўтобус, які стаіць ля школьнай заіржавелай жалезнай сеткі. Віленчукі кажуць, што гэта дар Аляксандра Лукашэнкі.

Настаўніцы чамусьці не пахваляцца падарункам з Мінска, так як і паездкамі ў прэзідэнцкі палац на навагоднюю ёлку. Кошт паездкі фінансуюць бацькі школьнікаў.

— А ці ладзіце краязнаўчыя ці экалагічныя экскурсіі ў Беларусь?

Замест адказу чую нараканні на візавы рэжым, прапіску, кошты падарожжаў, што парываецца сувязь з этнічнай радзімай. Гэта трагедыя, большасць настаўнікаў мае ў Беларусі сем'і. Каб наведаць бацькоў ці могілкі, неабходна патраціць многа часу.

— Гэта настолькі высмоктвае энергію, што людзі пра нішто больш і не думаюць, — чую ў адказ.

З боку Літвы няма таксама падтрымкі. Нацыянальныя меншасці вымушаны самі здабываць сродкі на мадэрнізацыю і развіццё. Усе, апрача беларусаў, маюць падтрымку ад сваёй Бацькаўшчыны.

Віленская беларуская школа дагарае прыхаваная ад вачэй у непрыкметным квартале. Няма ў яе сілы абараняцца. Першы сігнал — гэта інфармацыйная палітыка. Замест запрашаць СМІ з усяго Еўрасаюза і паказваць ім сваю праблему, журналістаў тут пазбягаюць як агню. Пра шанцы на будучыню гавораць лічбы. Прыгадайма, у пачатку было больш за 200 вучняў, а зараз іх 136. За 15 год існавання статыстыка павінна выглядаць якраз наадварот.

фота Ганны КАНДРАЦЮК

Мікрааўтобус падараваны Мінскам

Вярнуліся ў мінулае

Аляксей МАРОЗ

Прадстаўнікі розных пакаленняў, якія 18 лістапада г.г. выступілі ў Гайнаўскім доме культуры на XIV Прэзентацыях абрадавых калектываў, ладжаных Беларускім грамадска-культурным таварыствам, звярталі ўвагу на аўтэнтычны фальклор, з выкарыстаннем якога рыхтаваліся яны да мерапрыемства. Мае старэйшыя суразмоўцы ўспаміналі пра абрады, што памятаюць з маладосці і на падставе якіх узнікалі сцэнарыі калектыўных выступленняў. Дзеткі і моладзь рыхтаваліся да мерапрыемства на аснове сабранага раней фальклору і пераказаў іх бацькоў і бабуль. У асноўным старэйшая публіка радавалася, што мела нагоду вярнуцца успамінамі ў мінулае.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

„Рэчанька" аддала перавагу спевам і непаўторным дыялогам

Дзеткі з Прадшколля н-р 7 у Бельску-Падляшскім і Прадшколля н-р 3 у Гайнаўцы прыбылі са сваімі апекунамі. Іаанна Юзючук і Тарэса Артэмюк з Бельска ды Вера Масайла з Гайнаўкі знаёмяць дашкольнікаў з фальклорам і ўжо чарговы раз падрыхтавалі з малечамі абрадавыя сцэнкі. Гарачыя апладысменты гайнаўскай публікі, пахвальныя словы арганізатара мерапрыемства і захапленне бацькоў былі для дашкольнікаў падзякай за адважныя і цікавыя сцэнкі з вясковых „Вячорак", якія падрыхтавалі бельскія і гайнаўскія дзеткі. Моладзь з калектыву „Антракт" з Бельскага дома культуры і дарослыя акцёры з калектыву „Жэмэрва" Музея малой айчыны са Студзіводаў цікава паказалі ўжо забыты ў нас абрад „Рогулькі", у якім галоўнымі героямі былі дзяўчына-„рогулька" і малады хлопец, з якімі гуляла астатняя вясковая моладзь. Бельскія акцёры гаварылі, што ад гэтага абраду ў памяці нашых бабуль асталіся толькі песні.

— Рэканструкцыю „Рогулёк" зрабілі мы на падставе матэрыялаў, якія сабраў на нашай тэрыторыі прафесар Юзаф Ярашэвіч. Песні, якія ён запісаў, захаваліся даўжэй, чым сам абрад і пазней можна было іх запісваць, напрыклад, ад жыхароў Дабрывады ці іншых сёл, — кажа апякунка калектыву „Антракт" Альжбета Фіёнік. — Аднак такі абрад цяжка паказваць на сцэне. Лепш нам атрымліваецца, калі паказваем яго на прыродзе.

Вельмі адметным было супольнае выступленне бельскіх калектываў, якія пакарысталіся вопытам здабытым у Беларусі і ўдала ўцягнулі публіку да гульняў, запрэзентаваных у час абраду на сцэне. Самыя адважныя гайнаўскія дзеткі, моладзь, а нават дарослыя выйшлі перад гледачоў і згадзіліся, каб імі „заапекаваліся" маладыя людзі з „Антракта". Усе гульні адбываліся пад спеў „Жэмэрвы".

— Важна, каб старыя абрады паказваць маладым. Каб яны мацней зацікавіліся даўнім, добра зрабіць іх актыўнымі ўдзельнікамі гульняў, — заявіла Анна Фіёнік, кіраўнік „Жэмэрвы".

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Многімі рэквізітамі карыстаўся „Расспяваны Гарадок"

Спевакі „Жэмэрвы" прыглядаліся таксама да выступленняў старэйшых ад іх жанчын, якія вясковыя абрады памятаюць са сваёй маладосці і таму маглі вельмі хутка стварыць удалыя і цікавыя сцэнарыі для выступленняў на сцэне.

— Прэзентацыі даўніх абрадаў — самае цікавае мерапрыемства, у якім прымаюць удзел нашы калектывы, — заявіла пад уражаннем выступленняў вясковых калектываў апякунка „Антракта" Альжбета Фіёнік. Старшыня БГКТ Ян Сычэўскі і сакратар гэтай арганізацыі Валянціна Ласкевіч гаварылі, што прэзентацыя фальклорных абрадаў адбываецца ў розных мясцовасцях і пасля Гайнаўкі мерапрыемства можа быць перанесенае, напрыклад, у Бельск-Падляшскі. Беластоцкім арганізатарам многа дапамагала старшыня Гайнаўскага павятовага аддзялення БГКТ Іаланта Грыгарук.

Калектыў Гайнаўскага дома культуры, які выступаў пасля „Жэмэрвы", дастойна паказаў частку вяселля — „Выезд на шлюб".

— Мы песні і звычаі бярэм з Гайнаўшчыны, а частку нашага рэпертуару толькі тут можна спаткаць. Памятаем мы свой асабісты выезд на шлюб, але каб паказаць яго, трэба дапрацаваць дэталі, — тлумачыла дырыжор гайнаўскага калектыву Аліна Негярэвіч.

„Расспяваны Гарадок" сабраў песні, якія спяваліся ў час наваселля — сцэнка „Уваходзіны ў новую хату" — і з вялікай стараннасцю выконваў іх паміж дыялогамі, што вяліся ў такім выпадку паміж гаспадарамі, якія цешыліся новым домам і гасцямі, якія прыйшлі з падарункамі. Не абышлося тут таксама без цікавых аўтарскіх размоў, якія рыхтаваліся пад наглядам Ніны Цыванюк.

— Мы трымаліся пераказаў нашых бабуль і стараліся паказаць як найстарэйшы абрад. Толькі ўспамінаем пра малітвы і асвячэнне хаты, бо гэтага немагчыма паказаць на сцэне. Цяжкасці паявіліся, калі мы сталі рыхтаваць вопратку для выступленняў, але цяжка было б шыць новыя рэквізіты для аднаго абраду, — сказала Ніна Цыванюк.

Калектыў „Малінкі" з Маліннік удала выступіў з абрадам „Пэрэпэліця", за падрыхтоўкай якога наглядала кіраўнік калектыву Вера Нічыпарук.

— Выступалі мы на аглядах з рознымі абрадамі, а сёння прыехалі з вянком, які на Ваяводскіх дажынках у Саколцы заняў трэцяе месца. „Пэрэпэліцю" масава ладзілі ў нашым сяле, покі цераспалосіца не была ліквідавана. Я гэты абрад на сваім полі кожны год яшчэ паўтараю. Хачу, каб сямейнікі і суседзі паглядзелі, — кажа Вера Нічыпарук, якая падбірала таксама песні да выступлення ў Гайнаўцы. — Мелодыі песень я памятаю яшчэ з дзяцінства, а словы пазапісваў Сцяпан Копа. Наша сяло Маліннікі было вельмі расспяваным у мінулым. Я будучы яшчэ малой дзяўчынкай хадзіла са сваімі сямейнікамі на вячоркі і слухала даўняя песні, а пасля сама стала спяваць з моладдзю.

„Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага, выступаючы ў вялікім складзе, паказалі вясельныя „Пэрэжовіны". Побач спеваў і музыкі мусілі яны падрыхтаваць сцэнарый, каб уключыць да гутаркі як мага больш людзей. Так, як і ў выпадку іншых калектываў, у добрым кантакце з публікай рассеянай па вялікай зале ГДК дапамагала ім сучасная тэхніка. Жанчыны хадзілі з завушнымі мікрафонамі і ўдала раскручвалі маладую пару і вясельных гасцей да гульняў і спеваў. Мікола Мяжэнны і Галена Саковіч пазней звярталі ўвагу на сувязі іх абраду з вёскамі Бельшчыны.

Калектыў „Рэчанька" з Козлік паказаў „Вячоркі", дапрацаваныя і падрыхтаваныя пад наглядам Любы Гаўрылюк.

— Мы паказваем вясковыя сустрэчы такімі, якімі яны былі ў нашай вёсцы. Звярталі ўвагу, каб песні падыходзілі да звычайнай сустрэчы, а дыялогі мы рыхтавалі з дачкой Алай Каменскай, — інфармуе Люба Гаўрылюк.

З цікавымі „Вячоркамі" прыехаў таксама калектыў „Каліна" з Залук, за падрыхтоўкай якіх наглядала Валянціна Паплаўская.

Калектыў „Крыніца" з Беластока паказаў шыкарнае „Пэрэпіванне", падрыхтаванае пад кірункам Віктара Маланчыка.

— Найбольш членаў нашага калектыву з Гайнаўшчыны і Бельшчыны і таму адсюль бярэм мы найбольш нашага рэпертуару. Прыязджаючы ў Гайнаўку, вяртаемся ў свой родны кут, — кажа Уладзімір Іванюк, ураджэнец Сацоў.

— Мой дзед іграў на скрыпцы, бацька на гармоніку, а я спяваю, — заяўляе Мікола Вярбіцкі з Беластока і разам з сябрам, Юрыем Коршакам, гаворацьць, што вельмі любяць спяваць па-беларуску.

Калі я падышоў да „Збучанак", якраз рыхтаваліся яны да выступлення з абрадам „Покуделе".

— Нашых мужчын не зацягнеш на сцэну і таму адна з нас выступіць у ролі хлопца, які будзе рабіць фокусы для дзяўчат. Можа шнурок скіне з калаўротка або яшчэ нейкі жарт прыдумае, — расказвае кіраўнік калектыву Кацярына Ціханюк. Жанчыны звяртаюць увагу на рэквізіты, без якіх цяжка было б паказаць цікавы абрад і развесяліць публіку.

Вясёлы і паказаны з гумарам абрад прадставілі таксама „Незабудкі" з Курашава, якія назвалі яго „Радасць ад народжанага дзіцяці". Кіраўнік калектыву Ніна Грыгарук пераконвала, што ў мінулым яшчэ больш, чым цяпер, радаваліся нованароджаным.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

„Малінкі" запрэзентавалі вянок, які здабыў трэцяе месца на дажынках у Саколцы

Аб грамадстве Беларусі

Раіна СТЭФАНЧУК

Пра функцыянаванне няўрадавых арганізацый у шырокім іх разуменні і спробах будовы адкрытага грамадства на Беларусі пішуць аўтары кніжкі „Беларускае грамадства '2007. Надзеі, іюзіі, перспектывы"*, выдадзенай Усходнееўрапейскім дэмакратычным цэнтрам.

Рэдактар выдання Марта Пэйда ва ўступе абумоўліваецца: „Беларускае грамадства гэта надта спецыфічнае тварэнне. Цяжка гаварыць тут аб існаванні адкрытага грамадства, паколькі не дзейнічаюць — або не дзейнічаюць правільна — асноўныя інстытуты такога грамадства. Уласна кажучы, мабыць, няма на яго спецыяльнага запатрабавання; прынамсі можа так здавацца на аснове меркаванняў большасці". Нягледзячы на так песімістычную ацэнку, аўтары кніжкі спрабуюць прааналізаваць важнейшыя грамадскія з'явы, якія асацыююцца з грамадзянскай дзяржавай, а згаданы аналіз — здаецца — ужо сам па сабе дае аснову для роздумаў аб стварэнні ў будучыні на Беларусі такой дзяржавы.

Кніжка пачынаецца з артыкула палітолага і юрыста Юрыя Чавусава, які піша пра „сённяшні дзень беларускага грамадскага сектара". Прыводзіць ён вынікі даследаванняў, з якіх вынікае, што ажно пад 70% апытаных нічога не ведае пра дзейнасць няўрадавых арганізацый у сваім рэгіёне. Найбольш апытаных, больш за 65%, у адказ што такое грамадская арганізацыя, сцвярджала: „добраахвотнае згуртаванне людзей з мэтай вырашаць праблемы, якія турбуюць дадзеную групу, насельніцтва рэгіёна або ўсё грамадства". Амаль 67% апытаных не ўдзельнічала ў мерапрыемствах ладжаных грамадскімі арганізацыямі, а больш за 84% не ўдзельнічала ў мінулым годзе ў іх акцыях. У нейкай ступені дапаўненнем да прыведзеных даных і ўсяго артыкула з'яўляецца аналіз магілёўскага палітолага Паўла Усава аб дзейнасці беларускіх няўрадавых грамадскіх арганізацый. Даходзіць ён да вываду, што апошнім часам у Беларусі расце лік арганізацый, якія займаюцца г.зв. нейтральнымі пытаннямі, такімі як спорт ці экалогія, а таксама наглядаецца імкненне дзяржавы падпарадкаваць няўрадавыя арганізацыі для сваіх мэт і інтарэсаў з адначаснай ліквідацыяй арганізацый, якія стараюцца захаваць незалежнасць. З мэтай абгрунтавання сваіх тэзісаў аўтар публікуе табліцу, у якой падаюцца лікі дзеючых гэтага роду арганізацый. І так, найбольш зафіксавана спартыўных арганізацый — 506, дабрачынных — 356 ды адукацыйных, культурных і выхаваўча-педагагічных — 304.

Ужо польскі вопыт Жніўня 1980 паказвае, што важным элементам свабоднага грамадскага жыцця з'яўляецца дзейнасць незалежных прафсаюзаў. А як справа маецца ў Беларусі? Даць адказ на гэтае пытанне ўжо ў загалоўку свайго артыкула спрабуе лідэр Незалежнага прафсаюза работнікаў металургіі Аляксандр Бухвостаў: „Незалежныя прафсаюзы: дарогі ў падполле". Гаворачы аб прафсаюзным руху, сцвярджае ён: „Іх праца набыла цяпер форму барацьбы за шанаванне права і пашырэнне ўплываў; уключае яна таксама фармаванне груп падтрымкі незалежнаму прафсаюзнаму руху". Падобным чынам, ужо з загалоўка, можна даведацца пра сферу дзейнасці паасобных канфесій у Беларусі. Палітычны аналітык і публіцыст Алесь Уладамірскі свой тэкст азагаловіў: „У Беларусі рэлігійныя канфесіі не змагаюцца між сабою, толькі з дзяржавай". Піша ён: „Сапраўды, аб цывілізаваных, карэктных адносінах улады да рэлігійнага жыцця, асабліва да рэлігійных меншасцей, пакуль што гаварыць не прыходзіцца".

У кнізе „Беларускае грамадства..." змяшчаецца шэраг матэрыялаў на тэму, між іншым, спорту як ідэалагічнай зброі, жаночых арганізацый, становішча арганізацый гуртуючых польскую меншасць, беларускай дзяржаўнай ідэалогіі, СМІ, аховы здароўя, выбараў 2006 года. Апынулася ў ёй справаздача Камітэта абароны рэпрэсаваных „Салідарнасць", састаўленая Інай Кулей, прыватна жонкай лідэра дэмакратычных сіл Аляксандра Мілінкевіча, а таксама апісанне грамадзянскай кампаніі „За свабоду".

На канец варта ў гэтым месцы прывесці адзін сказ з артыкула Паўла Усава „Савецкі Саюз у межах асобнай дзяржавы": „Недарэчнасць, а нават абсурднасць ідэалогіі заключаецца ў сцвярджэнні, што ні дзяржава, ні народ не патрапяць самастойна існаваць без „моцнай рукі" і „ўказальнага пальца", а ім менавіта з'яўляецца прэзідэнт".

У кніжцы публікуюцца тэксты перакладзеныя з беларускай, рускай і англійскай моў Яраславам Іванюком (Польскае радыё Беласток), Янушам Дзюгевічам, Катажынай Ольчык, Мартай Пэйдай і Малгажатай Палубінскай.

* *Społeczeństwo białoruskie '2007. Nadzieje, złudzenia, perspektywy*, Wschodnioeuropejskie Centrum Demokratyczne, Warszawa — Mińsk 2007, ss. 112.

www.moladz.org

Роўна тры гады мінула з таго часу, калі на старонках „Нівы" ад 28 лістапада 2004 года мы распавядалі пра інтэрнэт-прадстаўніцтва моладзевай ініцыятывы „Вока", галоўная мэта якой — папулярызацыя беларускай мовы. Прыемна ўсведамляць, што і сёння даная ініцыятыва не толькі не згасла, але мае свой працяг і развіццё. У гэтым можна ўпэўніцца, калі зазірнуць на сайт **www.moladz.org**, які сам па сабе ўжо адлюстроўвае станоўчыя змены ў дзейнасці суполкі.

Калі параўноўваць цяперашні сайт з тым, які месціўся па адрасе **http://vo-ka.tk** тры гады таму, то адразу заўважым, што яго аўтары і натхняльнікі неяк пасталелі. Кідкага надпісу „любоў да Радзімы, павага да мовы" ўжо не ўбачыш, але можна знайсці значна больш вартасную інфармацыю аб тым, што было зроблена апошнім часам. Аб гэтым распавядаецца на старонцы „Нашы праекты".

У адрозненні ад тагачаснага сайта, гэты выглядае больш строга. Уверсе выяўлення — чырвоная палоска з назвай партала. Пад ёй — выйсці да некаторых рубрык. Трэба адзначыць, што яны месцяцца і з левага боку, а цэлы сайт падзелены на тры традыцыйныя часткі.

Адным з прыкмет развіцця „Вока", як становіцца заўважна па яго рэсурсе, стала тое, што апроч папулярызацыі беларускай мовы маладыя людзі заняліся таксама і падтрымкай усёй беларускай культуры. Гэта вынікае з рубрыкі „Мы", дзе яны распавядаюць пра свае мэты і задачы. „Маладзёвая інтэрнэт-пляцоўка «Вока», — пішуць яе актывісты, — гэта месца сустрэчы прадстаўнікоў віртуальнага грамадства Беларусі. На сённяшні дзень «Вока» (ВГ «Вока») з'яўляецца супольнасцю маладых, актыўных, таленавітых беларусаў з усяго свету. Маладзёвая інтэрнэт-пляцоўка «Вока» — гэта беларуская інтэрнэт-супольнасць, накіраваная на выхаванне моладзі на глебе беларускай нацыянальнай ідэі, на данясенне яе да шырокіх колаў грамадства. Асноўнымі задачамі ВГ «Вока» з'яўляюцца: агітацыйна-масавая дзейнасць па адраджэнню беларускай культуры, мовы, фармаванне ў людзей адказнасці за лёс сваёй дзяржавы, праява актыўнай грамадзянскай пазіцыі".

З гэтага прадстаўлення бачна, што „вокаўцы" з большага перамясціліся ў Інтэрнэт, стварыўшы віртуальную суполку ці кам'юніці, якія апошнім часам сталі вельмі папулярнымі.

Прыемна таксама бачыць, што навіны рэсурса абнаўляюцца даволі рэгулярна і закранаюць сапраўды надзённыя тэмы і актуальныя падзеі — напрыклад, навіна пра страляніну на занятках па беларускай мове ў Мінску.

Паколькі рэсурс арыентаваны на студэнтаў і моладзь, то тут можна знайсці прыклады студэнцкіх рэфератаў і сачыненняў па беларускай мове і літаратуры. Мяркую, што папросту падпісацца сваім імем пад такім творам з Інтэрнэта не ўдасца, бо выкладчыкі таксама маюць выйсці да падобных сайтаў.

Аб спосабах знаёмства з прывабнымі дзяўчынамі „Вока" распавядаецца на старонцы „Пікап", дзе даецца мноства карысных, на думку аўтараў сайта, парад, якія дапамогуць усталяваць шчыльныя адносіны з жаночым полам.

Даволі неардынарнай з'яўляецца старонка „Маладзёвы слэнг". Ён уяўляе з сябе нейкае месіва беларуска-руска-англійскіх слоў, якія мусяць патлумачыць кожны незразумелы выраз.

Праглядзець найбольш цікавыя, па меркаванні „вокаўцаў", відэасюжэты праз YouTube карыстальнікі патрапяць на старонцы „Відэаканал".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Нечаканы пад'ём

Хто б мог падумаць пасля ганебнай паразы ў Гомелі, што беларуская футбольная дружына здолее перамагчы ў дзвюх апошніх гульнях і ўзляцець у сваёй групе з безнадзейнага шостага месца на чацвёртае. Між тым гэта здарылася і пры грунтоўным разглядзе мае свае простыя тлумачэнні. Не трэба пакуль спяшацца з дыфірамбамі на адрас галоўнага трэнера Бернда Штанге. Пакуль толькі можна канстатаваць, што нямецкаму настаўніку ўдалося захаваць за сабой кіроўнае крэсла, а значыць — глабальная ацэнка яго працы будзе ў наступным цыкле.

А пакуль Штанге паслухаўся голасу розуму і па-сутнасці вярнуўся да складу зборнай двухгадовай даўніны, калі ёй кіраваў Анатоль Байдачны. Хоць колькі пытанняў да Штанге застаецца — чаму, прыкладам, не мае шанцу і месца ў зборнай лепшы снайпер нацыянальнага чэмпіянату Раман Васілюк? На руку новаму трэнеру прыйшліся таксама і авантурызм албанцаў і фестывальны настрой нідэрландцаў. Падначаленыя знакамітага ў мінулым футбаліста Марка ван Бастэна, які з-за траўмаў рана завяршыў сваю бліскучую кар'еру, прыехалі ў Мінск проста дагуляць адборавую кампанію. Ад апошняга матча былі вызвалены галоўныя зоркі прадстаўнікоў краіны цюльпанаў — галкіпер Эдвін ван дэр Сар (цікава, што яго дэбют за зборную Нідэрландаў прыпаў якраз на гульню ў сталіцы Беларусі ў 1995 годзе, калі нашы перамаглі 1:0), шматразовы трыумфатар Лігі чэмпіёнаў хаўбек Кларэнс Зедарф і грозны бамбардыр Руд ван Ністэльрой — усе трох прадстаўнікі элітных еўрапейскіх супер-клубаў. І без іх склад галандцаў выглядаў досыць прэзентабельна, але матывацыя беларусаў сталася мацнейшай. Першы тайм галоў не прынёс. А ў другім, пасля замены ў антракце капітана Аляксандра Глеба, нашы здолелі вызначыцца двойчы. У амаль суцэльным тумане на мінскім „Дынама" тандэм Віталь Булыга — Уладзімір Карыцька спадобіўся на дзве выніковыя камбінацыі. Заўважу, што да гэтага галандцы прапусцілі ўсяго 3 галы ў 11 гульнях (!). Толькі пад самы канец госці здолелі арганізаваць гол прэстыжу (зноў з-за пазіцыйнай памылкі цэнтральных абаронцаў). У выніку 2:1 і другая ў нашай футбольнай гісторыі перамога над Нідэрландамі. Паралельна Румынія разграміла албанцаў 6:1, а Славенія саступіла Балгарыі — 0:2. І вось яно наша 4-е месца. Усяго ў гэтым адборавым турніры Беларусь перамагла 4 разы, аднойчы згуляла ўнічыю і ажно 7 разоў цярпела паразу. За 12 гульняў забіта 17 галоў, а прапушчана ажно 23.

Куды больш важкія заданні рашае беларуская моладзевая дружына, якой кіруе Юрый Курненін. На мінулым тыдні каманда „заўтрашняга дня" разграміла Сан-Марына — 6:0 і падзяліла ачкі са сваім галоўным канкурэнтам — Сербіяй — 1:1. Беларусь мае зараз 16 пунктаў і стратэгічную турнірную перавагу. У сербаў 11 ачкоў і дзве гульні — вясной наступнага года на выездзе з санмарынцамі, а ў верасні дома з венграмі. Калі балканцы двойчы возьмуць верх, што надзвычай верагодна, беларусам у заключным матчы давядзецца перамагаць у Латвіі. Пры іншым раскладзе матч з паўночнымі суседзямі можа і не мець турнірнага значэння. У кожным разе маладыя беларускія футбалісты самі гаспадары свайго лёсу — шанцы трапіць у плэй-оф моладзевага чэмпіянату Еўропы-2009 (другі раз у гісторыі) надзвычай высокія. І гэты факт дадае добрага настрою на наступны сезон.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

У Кляшчэлях на Касцельнай

Уладзімір СІДАРУК

У Кляшчэлях па вуліцы Касцельнай жыве мой сябра Анджэй Санкевіч, з якім калісьці працаваў я на чыгунцы. Яго бацька ў мінулым меў кардачасальную машыну. Рашыў я затым наведаць прыяцеля ды пагаварыць з яго бацькам пра кляшчэлеўскія мануфактуры. Было гэта ў панядзелак, 12 лістапада. Сужонства Мікалая і Стэфанію Санкевічаў застаў я пры стале за гарбатай. Калі я выявіў мэту свайго візіту, гаспадар запытаў што з мінулага мяне цікавіць.

— Якраз гэта, аб чым мала зараз гаворыцца, — адказваю суразмоўцу. — Раскажыце пра фатаграфічнае атэлье Ежы Косткі. — І тут я пачуў такое.

— Бацька фатографа любіў паляваць. Меў ён бетонны завод, у якім вырабляў чарапіцу. Паколькі даўней дахі крылі саломай, дахоўка лічылася каштоўным матэрыялам і завод Косткі рабіў нядрэнны бізнес. А чарапіца была вогнетрывалай і якаснай. Жвір здабывалі з мясцовай жвіроўні. Апрача Ежыка ў сям'і быў яшчэ Мікалай (імя трэцяга сына не запамяталася). Жылі яны ў старэнькай драўлянай хатцы пры дарозе, якая вядзе з чыгуначнай станцыі.

Мікалай Санкевіч

Пры нямецкай акупацыі стары Костка быў сакратаром гміны ў Кляшчэлях. Кляшчэлеўцы казалі, што яго жонка была немкай. А Ежы атэлье адкрыў яшчэ ў міжваенны перыяд. Карыстаўся ён адмысловым апаратам, да фатаграфіі доўга прыбіраў асобу, а калі ўсё было на сваім месцы, дык накрываў чорнай накідкай сабе галаву і рабіў успышку. Фатаграфіі былі высакаякасныя. На кожным здымку ставіў ён фірменную пячатку. Атэлье Ежы Косткі было адзіным у наваколлі і карысталася папулярнасцю. Кожная шлюбная пара пасля вянчання абавязкова заязджала ў атэлье зрабіць здымак, а вясельныя госці чакалі на фурманках.

Апрача фатаграфавання Ежы Костка штодзень запісваў стан надвор'я. Карыстаўся ён пры гэтым барометрам. Фатограф быў старым кавалерам, крыху дзівакаватым. Любіў рабіць здымкі маладым дзяўчатам. Перш чым прыспасобіўся да здымка, дык столькі нагаварыў дзівацтваў дзяўчынам (хлопцам таксама), што тыя ахвотна ўцяклі б з крэсла. Наконт дзівацтваў фатографа было многа гаворкі, калі мяшчане даведаліся аб першай узнагародзе ў конкурсе на фатаграфію голай жанчыны. Мужыкі тады пасмейваліся ды казалі: „Стары, а дурны", але ён не браў гэтага ў галаву, бо і кабеце за пазіраванне даў нядрэнную стаўку, і яму шмат засталося. Пасля вайны на старой бацькавай сядзібе збудаваў ён шыкарны дом. Паміраў у адзіноце. Паколькі пасля ягонай смерці не знайшліся сваякі, у доме пасялілася шматдзетная бяздомная сям'я, якая прывяла дом у руіну. Зараз адно ўспаміны засталіся.

Апрача бетоннага завода і фатаграфічнага атэлье Косткаў, Кляшчэлі славіліся ў наваколлі вырабам льнянога алею ды гаршкоў.

— Алейню пры санацыі меў па вуліцы Касцельнай жыд Васэрман, — працягвае аповед мой суразмоўца. — Алей выраблялі з ільну і канапель. У яго было двое дзетак, незамужняя дачка і сын Янкель. Калі Васэрман рашыў дачку выдаць замуж, дык прадаў алейню, грошы аддаў у пасаг, а сам перасяліўся ў Бельск-Падляшскі. Традыцыю вырабу алею перанялі браты Сідарукі. Асабліва гэтым рамяством займаўся Валодзька. Пасля ягонай смерці алейніцтвам ніхто не займаецца.

— А што з вашай *грэмплярняй*? — пытаю.

— Адкрыў я яе ў 1954 годзе. Тады шмат сялян займалася авечкаводствам. Воўны было хоць адбаўляй. Многа яе часалі, бо з воўны рабілі валёнкі, світэры, блузкі, рукавіцы. З часам і гэтае рамяство загінула. Захавалася ў мяне па сённяшні дзень кардачасальная машына, стаіць у свіронку. У музей магу перадаць у падарунку, — заяўляе Мікалай Санкевіч.

Хоць Мікалаю Санкевічу неўзабаве стукне восемдзесят гадоў, здароўе ў яго нядрэннае. Чатырнаццацігектарную гаспадарку перапісаў ён на сына Анджэя. У яго пяць кароў, малако носіць у мясцовую злеўню. Хаця прыбытак ад таго невялікі, бо малочныя кааператывы мала плацяць, аднак малады гаспадар не пакідае гаспадаркі і працягвае бацькаву традыцыю. Ён — адзіны гаспадар на ўсю вуліцу Касцельную, які яшчэ трымае кароў.

Аб медычнай дапамозе

Быў мне назначаны тэрмін да артапеда ў Беластоцкім клінічным шпіталі. Адчакаў я, разумеецца, больш месяца ў чарзе. Ставіўся я акуратна раніцай у назначаны тэрмін. Калі прапісаўся ў рэгістрацыі, падаўся я ў прыёмную, якая змяшчалася ў сумежным калідорчыку. Да прыходу лекара заставалася больш чым паўгадзіны. Прысеўшыся на крэсла побач століка, прыкмеціў я лістоўку з надпісам: „3,2 злота штодзённа — столькі выдае РП на ўсю ахову здароўя на аднаго грамадзяніна", затым быў змешчаны малюнак кволага пацыента на шпітальным ложку. Далей: „900 злотых штодзённа — столькі прызначае РП на павіннасці аднаго парламентарыя" і малюнак джэнтльмена пад гальштукам побач шыкарнага аўтамабіля. Прыпіска: крыніцы інфармацыі — бюджэтная прапанова на 2007 год і фінансавы план НФЗ на 2007 г. ды інфармацыя канцылярыі парламента РП. З другога боку лістоўкі было напісана: „У канцылярыі прэм'ер-міністра працуе 500 асоб. Канцылярыя на сваю дзейнасць атрымала 85 мільёнаў злотых. Шпіталь пры такім жа ліку асоб можа разлічваць на кантракт з НФЗ не большы чым 20 мільёнаў, дзе апрача выдаткаў на плату вымушаны забяспечыць медычную дапамогу пацыентам, харчаванне і начлегі для 12 тысяч шпіталізаваных у год. Гэта, разумеецца, лістоўка Агульнапольскага саюза пратэстуючых лекараў.

У прыёмнай да артапеда знаходзілася больш дваццаці пацыентаў. Прыём пачаўся недзе а палове дзевятай. Мяне выклікалі трэцім па чарзе. Мой абследавальнік аказаўся сімпатычным чалавекам і вопытным спецыялістам. Паглядзеўшы на рэнтгенаўскі здымак, сказаў:

— Тут неабходная аперацыя калена...

— На такую хачу прапісацца, — заяўляю.

— Прыйдзецца пачакаць у чарзе...

— Колькі часу? — пытаю.

— Два-тры гады...

У час далейшай размовы я даведаўся, што аперацыю можна зрабіць прыватна, але гэта дарагая здзелка, бо ў Варшаве, напрыклад, трэба заплаціць дваццаць тысяч, а ў Беластоку — на чатыры тысячы менш. Далей артапед прызнаўся, што Беластоцкая клінічная бальніца заключае дамову з НФЗ на 100-130 такіх аперацый.

— Сам пратэз каштуе шэсць тысяч, — канстатаваў абследавальнік. — Затым патрэбны дадатковыя абследаванні, кроў і г.д.

На развітанні пачуў я толькі:

— Не назначаю канкрэтнай даты, паколькі невядома, які кантракт падпіша дырэктар бальніцы з НФЗ на наступны год. Паведамленне будзе дасланае на дамашні адрас. Чакайце затым...

Пакідаў я кабінет лекара з сумам у сэрцы і надзеяй, што новаабраны парламент акуратна паставіцца да праблемы. Затым буду чакаць лепшага часу.

(ус)

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	
			12	13	14	15	16	17	18	19	
20	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	32	33
						34	35	36	37	38	39	40	41
					42	43	44	45	46	47	48	49	50	51

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Мікіты Хрушчова.

1. тонкая паўпразрыстая тканіна з ільняной або баваўнянай пражы = 13 _ 12 _ 32 _ 33 _ 31 _ 8 _;

2. валакністы матэрыял для медыцынскіх, бытавых і тэхнічных мэт = 25 _ 24 _ 39 _ 40 _;

3. выраб з цяжкай варсістай узорыстай тканіны, якім упрыгожваюць сцены і падлогу = 23 _ 9 _ 36 _ 35 _ 34 _;

4. бывае ў роце, баране, пружыноўцы = 20 _ 22 _ 21 _;

5. у Лукашэнкі Аляксандр = 7 _ 47 _ 46 _;

6. краіна са сталіцамі ў Пхеньяне ў Сеуле = 51 _ 48 _ 49 _ 50 _ 14 _;

7. хімічны элемент н-р 29 = 41 _ 44 _ 42 _ 43 _ 28 _;

8. дзяржава з Панамскім каналам = 4 _ 5 _ 45 _ 26 _ 29 _ 30 _;

9. адна з карэйскіх сталіц = 2 _ 3 _ 1 _ 6 _;

10. псеўданім Іосіфа Броза = 27 _ 11 _ 38 _ 37 _;

11. сабачка = 15 _ 17 _ 18 _ 19 _ 10 _ 16 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 43 нумара

Трызна, мяцеліца, Прапойск, явар, есаул, Буш, Янус, Шчэрба, суніца.

Рашэнне: **Прыяцеля пазнаеш у няшчасці.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2008 r. upływa 5 grudnia 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2008 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połudn. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 730 egz.

Бязмежжа. Мы з гэтай зямлі...

фрагмент эсэ чытаны на „Бязмежжы"

Міра ЛУКША

Частка ўдзельнікаў „Бязмежжа" перад клуняй — музеем Барыса Казлоўскага (сядзіць)

„Паэзія гэтая — ад рэчкі Нарвы і балот...", — пісаў у рэцэнзіі на першую кнігу прозы Міры Лукшы ў 1992 годзе Сакрат Яновіч, першанівец ад 1956 года. Усе яны, хто хацеў выказаць свае думкі і пачуцці на роднай мове, прайшлі праз беластоцкую „Ніву", якую назваў так, як спадчыннiцу віленскай „Нівы", заснавальнік і „Нівы", і Беларускага грамадска-культурнага таварыства ды гуртавальнік і абуджальнік тутэйшага беларускага літаратурнага руху ды і самой „Белавежы" хлопец з суседняй Белавежы, крыху старэйшы ад пачаткоўцаў, бо трыццацігадовы тады, Георгій Валкавыцкі. Ён і дагэтуль гойсае па белавежскіх гонях, хоць яму добра за восемдзесят — непадалёк ад гэтага месца, дзе мы тут апынуліся — у Новым-Ляўкове. І нават гаворка ў нас падобная — белавежска-семяноўская, пушчанская. Усе дарогі вялі ў „Ніву" і праз „Ніву" — ці то карэспандэнтаў — шукальнікаў, шчырых выяўляльнікаў праўды, допісы якіх заўжды былі акрашаны залатымі крышынамі народнага гумару і здаровых думак, былі свайго роду часам лірычнай публіцыстыкай, або былі аўтары з натуры паэтамі — чытачамі паэзіі, знойдзенай у кніжыцах, прывезеных з далёкай Сібіры з бежанства — Пушкіна, Лермантава, Кальцова і іншых, пасля таксама і друкаванай у „Ніве". Карэспандэнты ці проста чытачы знаёміліся праз „Ніву", як у апошнім нумары расказвала Надзея Каролька пра свайго мужа Кастуся з суседняга з „Бора-Здроем" ляўкоўскага хутара, які спецыяльна паехаў быў да ніўскага аўтара з суседняй гміны, адно праз рэчку, у Рыбакі, да Хведара Хлябіча, які і сам пісаў вершы, і склаў своеасаблівы зборнік вартай паэзіі, дзе змяшчаў самыя, на яго здаровую і рамантычную думку, прыгожыя і трапныя вершы, і набраў ад яго гэтых вершаў, і вывучаў іх, і дэкламаваў нават хоць і самой жонцы ды дзецям. Такім чынам ніўцы — працаўнікі „Нівы", аўтары і героі станавіліся адной сям'ёй, а наш тыднёвік трактаваўся як свайго роду родны хроніка-альбом, які на працягу больш за паўстагоддзя ўвекавечыў амаль кожны кавалачак Беласточчыны і шмат каго пазнаёміў адны з аднымі. А ў кожнай гміне — гаварылася — ёсць прынамсі двух паэтаў. Часта выхаваных ад маленства з тыднёвікам „Ніва" ў ранцы. У нашу школу ў Семяноўцы — яна ўжо цяпер не пачатковая школа, а цэнтр экалагічнай адукацыі — у кожную пятніцу „Ніву" прыносіў лістаноша і мы кідаліся на яго ды вырывалі родную газету навыперадкі, хоць, вядома, кожнаму падпісчыку яе хапіла. Калі мне было 14 гадоў, на яе старонках паявіліся мае вершы ў рубрыцы „Парнасік", задуманай Георгіем Валкавыцкім як палетак для пачаткоўцаў. Пачыналі ў ім амаль усе дэбютанты сямідзесятых гадоў, пакуль трапілі на літаратурную старонку „Белавежы", м.інш. Мікалай Варанецкі з Альхоўкі, Юрка Харкевіч з Лешукоў. Для нас тыя, хто ўжо друкаваўся ў адных з першых нумароў „Нівы" — як маладзенькі тады, цяпер 66-гадовы Валодзя Гайдук з Тарнопаля, ці ў той час вучань і пасля настаўнік з Ляўкова, будучы ніўскі журналіст і карэспандэнт Янка Цешушэцкі, — былі ўжо тутэйшымі класікамі. Не гаварыўшы ўжо пра зарэчанскіх, занарваўскіх Аляксандраў Баршчэўскіх, сярод якіх пазнейшы славуты Алесь Барскі, ці аўтары, тады для нас маладых, дзяцей, шакіруюча жывыя, бы зышоўшыя са сцен кабінета беларускай мовы, мала меншыя ад Купалы і Коласа — Віктар Швед ці той Барскі, якія лічыўшы ў тысячы праводзілі свае аўтарскія сустрэчы ў школах і на народных фэстах. Папраўдзе, калі б пакалупацца, папрыглядацца ствалам, карэнню ды адгалінаванням роднасных дрэў, дык дашукацца можна было б сваяцтва, роднаснасці не толькі па духу і месцы, адкуль мы родам. Тут усюды, бачыце, сваякі. Як у томіку „Сваякі", гуртуючым фрагменты твораў нашых „народных паэтаў" Бельшчыны, Гайнаўшчыны, Сакольшчыны (і яны былі ў „зборнічку" — тоўстым сшытку рыбацкага Хведара Хлябіча!).

Уладзімір Гайдук — літаратурная кветка гэтай зямлі

З-за рэчкі, з бандарскага староння, выводзіцца, вось, таксама літаратурны крытык Уладзімір Казбярук з Мінска, які таксама прыклаў сваю думку да вывучэння багатай ужо творчасці сяброў Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа". Можна сказаць, мы — з тутэйшай вёскі, наша душа на ўсходзе, цытуючы Тэрэзу Занеўскую. І ці гэта будзе земляроб — як Валодзя Гайдук, які ўсё жыццё аж да пенсіі араў, касіў ды даіў, ці філолаг-„аматар кніг" па адукацыі — як Міра Лукша, ці настаўнік — як Мікола Варанецкі, Янка Целушэцкі ці прафесар Барскі, якім можа і здаецца, што вучоным мужам бліжай абсалюту — усе яны ўслаўляюць тое роднае наднарваўскае балоцістае роднае месца, вільготнае, здаровае, што ўзгадавала іх такімі як яны — і ўсе іншыя тутэйшыя — і ёсць. У сваім месцы, дзе правялі басаногае дзяцінства, пад сваім небам, нават калі лёс ці патрэба закінулі іх у невядома якія варшавы, яны родныя гэтым дрэвам і дарогам, межам і бязмежжам, аблогам і нівам. І калі ўзрастае тое, што сеюць, тым вялікшая радасць. Радасць вялікая, калі ў хатах жывуць людзі, у былых — ну, хай і былых — школах культурныя і адукацыйныя цэнтры — як у Семяноўцы ці ў Нараўцы, дзе ў школе адкрыта галерэя імя тутэйшай дзяўчыны, нараўчанкі Тамары Саланевіч, калі спрытныя і кемлівыя людзі, як тутэйшы гаспадар Бора Казлоўскі, кажуць, што з беларушчыны, як з усяго здаровага і файнага, можна жыць, не цураючыся свайго, а меўшы і гаспадарскі прыбытак, а не лапцюжнае енчанне ды нараканне, што быць гаспадром гэта смешна і непрэстыжна. І пішуцца ды выдаюцца кнігі — як юбілейная белавежская „Шлях па прамой часу — 1958-2008", дзе і пра нараўчанскіх пісьменнікаў таксама пішуць — ужо нават і цалкам нетутэйшыя даследчыкі. Ці думае аўтар, тым больш пішучы на роднай мове, калі **мусіць** пісаць, бо такая патрэба ягонай душы — пра тое, што будуць яго чытаць, а тым больш даследаваць, абмяркоўваць ім напісанае? Можаце спытацца ў Валодзі Гайдука. А яму прасцей сказаць словамі верша:

І скрып пяра ў начной цішы. / Лебедзь астральны і трава ў расе. / Пачуць хоць раз жаданы спеў, /А потым вочы стомлена на міг закрыць.// Час працы словы ажывіў — апраўдаў труд. / Гармоніі закон у новай форме. / Дух бунту актам стаў пакоры — / У вершы завяршыўся Абсалют. („Пах аернага хлеба", Беласток, 1997).

У творчасці тутэйшых аўтараў паяўляецца і яно — месца. Месца-калыска. Пакінутае. Ды вечнае. Адарвацца ад яго немагчыма. Ад дому.

У галерэі імя Тамары Саланевіч (у цэнтры ў шаліку Віктар Кабац)

02.12 – 08.12

Баран (22.03. — 20.04.) „З грашмі не так добра, як дрэнна без іх". Няма асаблівых шанцаў на поспехі, звычайны, спакойны тыдзень. У каханні — час падрахункаў. Сям'я і сябры — поспех у калектыве.

Бык (21.04. — 21.05.) „Чалавек разумны мае перавагу над іншымі не так у выбары добрых рэчаў, як у пазбяганні благіх". Тыдзень выклікаў. Каханне — не слухай плётак. Праца і фінансы — найлепш з гэтым асцярожна. Здароўе — адпачынак і пачуццё гумару.

Блізняты (22.05. — 22.06.) „Добрае выхаванне — пільнае скрыванне таго, як мы добра думаем аб сабе, а блага аб іншых". Тыдзень працы і сур'ёзных адносін да здароўя. Час разважлівых раманаў. З сябрамі і сям'ёй папі гарбаты. Пільная праца і навука. У здароўі пазітыўныя змены.

Рак (23.06. — 23.07.) „Самы шчаслівы чалавек гэта той — хай ён кароль, хай жабрак — хто знаходзіць спакой у сваёй хаце". Зоркі дададуць табе крылаў. У каханні сонечныя дні. Радасныя моманты і новыя захапленні сярод радні і сяброў. Новыя шанцы ў працы і фінансах.

Леў (24.07. — 23.08.) „Чалавек пяройдзе свет шукаючы шчасця, а знаходзіць яго вярнуўшыся дахаты". Бляскі і цені ў сям'і. Асцярожна з фліртамі. Важныя сямейныя ўрачыстасці. Пазбягай змен на працы. Зменныя кандыцыя і здароўе.

Дзева (24.08. — 23.09) „Быць жанчынай гэта сапраўды цяжкі занятак, паколькі справа ў тым, што галоўным чынам маецца дачыненне з мужчынам". Вятры спрыяюць. Не фліртуй зашмат. Супольныя ініцыятывы з сям'ёй і сябрамі. Навука — ключ да магутнасці. Дасканалая форма здароўя.

Шалі (24.09. — 23.10.) „Недастаткова таго, што ты любіш грошы, грошы павінны любіць цябе!" Тыдзень фінансавых аналізаў. Рамантычныя гульні. Праца і фінансы: каханыя грошыкі! Здароўе ў норме (толькі не пі літрамі кавы ды высыпайся!).

Скарпіён (24.10. — 22.11.) „Жыццё — як гульня ў брыдж. Тое, якія ты карты дастанеш, гэта дэтэрмінізм. Тое, як іх выкарыстаеш — вольная воля". Планы і надзеі на лепшую будучыню. Каханне — жарсці і недахоп памяркоўнасці. Цяжка ўседзець дома. Час экспансіі ў фінансах. У здароўі ты — міс Задыяка.

Стралец (23.11. — 22.12.) „З гадамі так як кнігамі Сыбіліі — чым больш іх згарыць, тым становяцца даражэйшымі". Спавольні тэмп! У каханні — без змен. Час ашчаднасці і хатняга сядзення. Не рызыкуй непатрэбна ў фінансах. Ненайлепшая форма.

Казярог (23.12. — 20.01.) „Вопыт — сума памылак здзейсненых і тых, якіх з жалем мы не здзейснілі". Тыдзень надзей. Каханне — выезды і вяртанні. Госць у хату — Бог у хату. Прыхільнасць кіраўніцтва. Здароўе — кандыцыя ў клетку.

Вадалей (21.01. — 19.02.) „Надзея — своеасаблівае шчасце і — мабыць — адзінае шчасце, на якое свет можа сабе дазволіць". Кар'ера перадусім! У каханні нервовыя непаразуменні. Службовыя банкеты. Час амбітных намераў на працы. Асцярожна з алкаголем!

Рыбы (20.02. — 21.03.) „Чалавек смяецца з кахання так доўга, пакуль тое яго не спасцігне". Снежаньскія шаленствы! У каханні мілыя хвіліны. Адкрыты дом. Час навучання, новай дзейнасці, асабліва для пенсіянераў. Знакамітая форма (варта паладзіць сваё здароўе ў санаторыі).

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960